# ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ
# БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
# ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ
# на 2011–2015 гг.

Праграму распрацавалі:
Ю.П.Бондар (главы I, II, III, V, VI; параграфы IV.III, IV.VII)
К.І.Рэмішэўскі (параграфы IV.II, IV.IV)
В.В.Макравусаў (параграф IV.VIII)
Р.А.Ровіна, С.Л.Шпарло (параграф IV.I)
Т.В.Альхімовіч (параграф IV.VI)
В.В.Казлоўскі (параграф IV.V)

Агульная рэдакцыя – Ю.П.Бондар

*Праграма адобрана на пасяджэнні Савета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 5 ад 18.01.2011 г.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## I. ПЕРАДУМОВЫ РАЗВІЦЦЯ

У сучасных умовах глабалізацыі і інтэграцыі сусветнай супольнасці і з улікам перспектыў эканамічнага і сацыяльнага развіцця Рэспублікі Беларусь Праграма развіцця ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» на 2011–2015 гг. (далей – Праграма) як унікальнага навукова-адукацыйнага, мастацка-творчага комплексу накіравана на падтрыманне канкурэнтаздольнасці Рэспублікі Беларусь у глабальным спаборніцтве інавацыйных супольнасцей і эканомік, заснаваных на ведах.

Праграма грунтуецца на палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, зацверджанай на IV Усебеларускім народным сходзе 8 снежня 2010 г., Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)», патрабаваннях нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь, пазітыўным вопыце вядучых універсітэтаў свету і ўлічвае ўнікальныя асаблівасці і творчы патэнцыял БДУКМ як вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сферы культуры і мастацтваў у нацыянальнай сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Праграма грунтуецца на каштоўнасцях, якія склаліся і прымнажаюцца ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» – нацыянальным шматпрофільным, гуманітарным навукова-адукацыйным, сацыяльна-культурным і мастацка-творчым цэнтры Рэспублікі Беларусь. Калектыў універсітэта забяспечвае падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для ўстаноў і арганізацый сацыяльна-культурнай сферы і мастацтва, захоўвае і прымнажае класічныя традыцыі нацыянальнай культурнай спадчыны і ўніверсітэцкай адукацыі, распаўсюджвае і сцвярджае гуманістычныя ідэалы сусветнай культуры.

Праграма накіравана на забеспячэнне лідэрства ўніверсітэта ў адукацыйнай, выхаваўчай, навуковай і творчай сферах. Паказчыкі, дасягнутыя Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, могуць стаць арыенцірамі, якія вызначаюць напрамкі і ўзроўні развіцця як асобных беларускіх ВНУ, так і ўсёй сістэмы мастацкай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## II. ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Сучасны стан Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў характарызуюць фундаментальнасць навуковых даследаванняў, заснаваных на традыцыях навуковых школ, якасць і бесперапыннасць розных узроўняў падрыхтоўкі,

міждысцыплінарнасць падыходаў у адукацыі і навуцы, удзел выкладчыкаў і студэнтаў у міжнародных праектах, шматграннасць творчай дзейнасці і высокія мастацкія дасягненні творча-педагагічных школ, эфектыўнасць выхаваўчай работы са студэнцкай моладдзю.

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў дасягаецца дзякуючы высокаму навукова-педагагічнаму статусу прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта. Ва ўніверсітэце працуе больш за 340 штатных выкладчыкаў і больш за 120 сумяшчальнікаў. Сярод выкладчыкаў, якія працуюць на пастаяннай аснове, уключаючы ўнутраных сумяшчальнікаў, больш за палову маюць вучоныя ступені, ганаровыя і вучоныя званні, з іх: 1 акадэмік, 31 доктар і прафесар, больш за 220 дацэнтаў і кандыдатаў навук; 11 выкладчыкаў – ганаровыя званні заслужаны артыст, народны артыст, заслужаны дзеяч культуры, заслужаны дзеяч адукацыі.

Падрыхтоўка спецыялістаў ва ўніверсітэце вядзецца па дзённай і завочнай формах навучання. Па стане на 01.12.2010 г. ва ўніверсітэце навучаюцца 5952 студэнты, у тым ліку 74 на II ступені вышэйшай адукацыі. З іх на дзённай форме навучання – 2923, на завочнай – 2955 чалавек.

Структура ВНУ і сістэма ўзаемадзеяння структурных падраздзяленняў фарміруецца ў адпаведнасці са Статутам універсітэта і ўключае 6 факультэтаў (культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці; музычнага мастацтва; традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва; інфармацыйна-дакументных камунікацый; завочнага навучання; павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў), 25 кафедраў, з якіх 21 з’яўляецца выпускаючай, бібліятэку, а таксама шэраг падраздзяленняў структуры кіравання, дапаможныя службы і інш. У структуру ўніверсітэта як цэласнага навукова-адукацыйнага комплексу ўваходзіць філіял у г. Мазыры.

Структура падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва адпавядае сучасным патрабаванням, якія прад’яўляюцца да ВНУ ўніверсітэцкага тыпу, і ўключае наступныя ступені: вышэйшую адукацыю I ступені, вышэйшую адукацыю II ступені (магістратура), аспірантуру, дактарантуру, перападрыхтоўку кадраў з вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Падрыхтоўка спецыялістаў на I ступені вышэйшай адукацыі ва ўніверсітэце вядзецца па 16 спецыяльнасцях: «Сацыяльная педагогіка», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)»; «Дырыжыраванне (па напрамках)»; «Духавыя інструменты (па напрамках)»; «Спевы (па напрамках)»; «Рэжысура (па напрамках)»; «Мастацтва эстрады (па напрамках)»; «Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)»; «Народная творчасць (па напрамках)»; «Мастацтвазнаўства (па напрамках)»; «Культуралогія (па напрамках)»; «Літаратурная работа (па напрамках)»; «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)»; «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)»; «Сацыяльна-культурная дзейнасць»; «Сацыяльная праца».

Навучанне ў магістратуры – па 5 спецыяльнасцях: «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці», «Культуралогія», «Мастацтвазнаўства», «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», «Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў».

Пры ажыццяўленні набору прыярытэт аддаецца перспектыўным спецыяльнасцям: бібліятэказнаўству і бібліяграфіі, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, мастацтву эстрады, рэжысуры свят, харэаграфічнаму мастацтву. Характэрнай асаблівасцю прыёму ва ўніверсітэт з’яўляецца тое, што ў аснову адукацыі пакладзены прынцып бесперапыннасці. На ўступных экзаменах перавага аддаецца моладзі, якая ўжо мае сярэднюю спецыяльную адукацыю па профілі спецыяльнасці. Так, па спецыяльнасцях музычнага, харэаграфічнага, мастацкага профіляў на першы курс прымаюцца юнакі і дзяўчаты пасля заканчэння музычных, мастацкіх, харэаграфічных вучылішчаў і каледжаў.

З 1975 г. універсітэтам падрыхтавана больш за 20 тыс. высокакваліфікаваных спецыялістаў для сферы культуры, мастацтва і адукацыі. Адметнай асаблівасцю выпускнікоў універсітэта з’яўляецца тое, што яны валодаюць не толькі сістэмай фундаментальных тэарэтыка-метадалагічных ведаў, але і сістэмай уменняў і навыкаў прыкладнога характару. Гэта дазваляе забяспечыць установы культуры гарадоў, раённых цэнтраў, вёсак кадрамі вышэйшай кваліфікацыі. Практычна ва ўсіх раённых і гарадскіх дамах і палацах культуры працуюць выпускнікі ўніверсітэта. Яны ўзначальваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійныя і аматарскія мастацкія калектывы, з’яўляюцца выкладчыкамі музыкі, тэатральных, харэаграфічных і мастацкіх дысцыплін.

Арганізацыя навучальнага працэсу ажыццяўляецца на аснове адукацыйных стандартаў, адзіных для дзённай формы навучання і навучання без адрыву ад вытворчасці, тыпавых і вучэбных планаў спецыяльнасцей, зацверджаных і зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку. Адукацыйныя стандарты вызначаюць агульныя патрабаванні да ўзроўню вышэйшай адукацыі, тэрмінаў навучання, максімальны аб’ём вучэбнай нагрузкі, крытэрыі ацэнкі якасці адукацыі. Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь другога пакалення па спецыяльнасцях распрацаваны ва ўніверсітэце ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і зацверджаны загадамі Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2008 г.

Падрыхтоўка спецыялістаў на першай ступені вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца на 1–3-х курсах у адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі другога пакалення, на 4–5-х курсах – першага пакалення. На кафедрах вядзецца пастаянная работа па ўдасканаленні вучэбна-метадычнага забеспячэння. На базе зацверджаных тыпавых і вучэбных праграм ствараюцца падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы новага пакалення.

Улічваючы спецыфіку і задачы падрыхтоўкі спецыялістаў адпаведнага профілю, надаецца значная ўвага пытанням камп’ютарнага абсталявання навучальнага працэсу. Камп’ютарны парк універсітэта пастаянна абнаўляецца і налічвае больш за 300 адзінак. Непасрэдна для навучальных заняткаў задзейнічана 11 камп’ютарных класаў на 87 працоўных месцаў на базе камп’ютараў 2007–2009 гг. выпуску, для самастойнай работы студэнтаў абсталяваны інфармацыйны цэнтр на 28 працоўных месцаў. У 2008 г. адкрыта электронная бібліятэка на 14 працоўных месцаў і 10 камп’ютарызаваных працоўных месцаў у чытальнай зале. Такім чынам, студэнтамі ў навучальным працэсе і для самападрыхтоўкі выкарыстоўваюцца 139 адзінак камп’ютарнай тэхнікі.

Стратэгічнай лініяй павышэння якасці адукацыі ва ўніверсітэце з’яўляецца арыентацыя на ўдасканаленне самастойнай працы студэнтаў за кошт адпаведнага арганізацыйнага, навукова-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

З улікам спецыфікі падрыхтоўкі кадраў асаблівая ўвага надаецца стварэнню вучэбна-творчых майстэрняў і студэнцкіх творчых калектываў. Сумесная творчасць выкладчыкаў і студэнтаў у такіх умовах дазваляе ў пэўнай ступені забяспечыць прафесійную падрыхтоўку будучых артыстаў, мастакоў, харэографаў, арганізатараў мастацкай творчасці.

Размеркаванне выпускнікоў праводзіцца ў адпаведнасці з Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў, якія навучаюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў ва ўстановах адукацыі, забяспечваючых атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.10. 2002 г. № 1423.

Запатрабаванасць выпускнікоў за апошнія пяць гадоў застаецца нязменна высокай – на аднаго маладога спецыяліста, які падлягае размеркаванню, прыходзіцца па два запыты ад патэнцыяльных работадаўцаў.

Адной з характарыстык міжнародных пазіцый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з’яўляецца цікавасць да навучання з боку замежных грамадзян. Пра гэта сведчыць станоўчая дынаміка колькасці іншаземцаў, што навучаюцца ва ўніверсітэце. Так, у 2007/08 г. ва ўніверсітэце навучалася 116 грамадзян з 11 краін далёкага і блізкага замежжа, у 2008/09 г. – 131 чалавек. У бягучым навучальным годзе ва ўніверсітэце навучаюцца 254 замежныя грамадзяніны з 19 краін. Удвая вырасла колькасць краін, якія даслалі сваіх студэнтаў: КНР, Турцыя, Сірыя, Іран, Індыя, Камерун, Польшча, Літва, Латвія, Азербайджан, Малдова, Туркменістан, Арменія, Грузія, Украіна, Расійская Федэрацыя.

Ва ўніверсітэце прызнаныя 4 навукова-педагагічныя школы: у галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» (доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў); у галіне педагогікі «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» (доктар педагагічных навук, прафесар Я.Д.Грыгаровіч); у галіне мастацтвазнаўства «Кампаратыўнае мастацтвазнаўства» (доктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства, прафесар В.П.Пракапцова); у галіне культуралогіі «Сусветная і айчынная культура» (доктар філасофскіх навук, прафесар М.А.Мажэйка; доктар культуралогіі, прафесар А.І.Смолік).

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі ажыццяўляецца праз аспірантуру з 1989 г. і дактарантуру з 1998 г. У цяперашні час ва ўніверсітэце праходзяць навучанне 3 дактаранты, 69 аспірантаў (49 – вочна, 20 – завочна), 14 замежных аспірантаў (КНР, Камерун). Навуковае кіраўніцтва і навуковае кансультаванне аспірантаў і дактарантаў ажыццяўляюць 17 дактароў навук, прафесараў і 36 кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Сёння ва ўніверсітэце працуюць 2 дысертацыйныя саветы:

– савет па абароне дысертацый Д 09.03.01. У кампетэнцыю савета ўваходзіць абарона дысертацый на суісканне вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук па спецыяльнасцях 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва (мастацтвазнаўства) і 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры (культуралогія);

– савет па абароне дысертацый К 09.03.01, якому дазволена праводзіць абароны дысертацый па спецыяльнасцях 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (педагагічныя навукі) і 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці (педагагічныя навукі).

Агульная колькасць абарон за апошняе пяцігоддзе пададзена ў табліцы:

| Абаронена дысертацый | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|
| Доктарскіх | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 |
| Кандыдацкіх | 9 | 3 | 6 | 8 | 11 |
| Усяго… | 10 | 4 | 7 | 9 | 11 |

Працэнт абарон кандыдацкіх дысертацый выпускнікамі аспірантуры на працягу 3 гадоў пасля яе заканчэння складае за гэтыя гады – 26,8% (11 чалавек).

У перыяд з 2006 г. суіскальнікамі дактарантуры абаронены 4 доктарскія дысертацыі: 2 – у дысертацыйным савеце ўніверсітэта, 1 – у Інстытуце мастацтвазнаўства г. Масквы, 1 – у Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце (факультэт паліталогіі і філасофіі).

Ва ўніверсітэце функцыянуюць праблемныя саветы па профільных спецыяльнасцях: мастацтвазнаўстве, культуралогіі, педагагічных навуках, гістарычных навуках, філасофскіх навуках, філалагічных навуках. Праблемныя саветы аб’ядноўваюць кафедры на аснове агульнасці вырашаемых імі навуковых задач і блізкасці тэматыкі з мэтай засяроджвання намаганняў на комплексных навуковых напрамках дзейнасці ўніверсітэта, ажыццяўляюць навукова-метадычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва навукова-даследчай дзейнасцю студэнтаў, аспірантаў, дактарантаў і суіскальнікаў.

У 2010 г. завяршыўся перыяд выканання заданняў галіновай навукова-тэхнічнай праграмы «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.». З 2008 г. функцыі галаўной арганізацыі па вышэйназванай праграме былі замацаваны за Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Даследаванні, рэалізаваныя ў рамках праграмы, забяспечылі магчымасць аптымізацыі кіравання навукова-даследчымі працамі ў сферы культуры і мастацтва, стварылі спрыяльныя ўмовы для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, развіцця навуковых школ, рэалізацыі інтэлектуальнага патэнцыялу маладых вучоных.

Навукова-даследчая работа ажыццяўляецца на 24 кафедрах і ў 2 лабараторыях – навукова-творчай лабараторыі традыцыйных рамёстваў беларусаў і навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў. За 2006–2010 гг. праведзены прыкладныя і фундаментальныя даследаванні па 27 тэмах, зарэгістраваных у Беларускім інстытуце сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы.

Аб’ём фінансавання навуковых даследаванняў з дзяржбюджэту за 2007–2010 гг. склаў 961,2 млн руб.

Вынікі даследаванняў, праведзеных у 2010 г., адлюстраваны ў навуковых публікацыях, сярод іх: 11 манаграфій, 8 зборнікаў навуковых прац, 22 падручнікі і навучальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікі (5 – з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), 14 вучэбна-метадычных выданняў, 13 дэпаніраваных навуковых прац, 390 артыкулаў у навуковых часопісах і зборніках (59 – у рэцэнзуемых выданнях ВАК і 82 – у замежных навуковых выданнях), 279 тэзісаў навуковых канферэнцый і 18 электронных выданняў. Агульны аб'ём публікацый прафесарска-выкладчыцкага саставу ўніверсітэта ў 2010 г. склаў больш за 960 друкаваных аркушаў.

Цэнтрам інфармацыйна-бібліятэчнага забеспячэння даследчай і адукацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з'яўляецца бібліятэка. У фондах бібліятэкі сабраныя каля 550 тыс. кніг і рукапісаў, карыстальнікам прадастаўляецца доступ больш чым да 100 тыс. электронных крыніц, уключаючы навуковыя часопісы, манаграфіі, дысертацыі і даведачныя выданні.

Дзейнасць універсітэцкіх студэнцкіх аркестраў, харавых, тэатральна-драматычных, харэаграфічных, вакальных і інструментальных студэнцкіх калектываў вядомая далёка за межамі Беларусі. Ва ўніверсітэце актыўна развіваюцца больш за 50 вучэбных творчых калектываў, якія забяспечваюць падрыхтоўку кіраўнікоў і артыстаў музычных, харэаграфічных, тэатральных калектываў, студый народна-прыкладнога мастацтва, арганізатараў аматарскай творчасці, мастацкай самадзейнасці і святочна-абрадавай дзейнасці.

За апошнія два гады каля 140 студэнтаў універсітэта сталі лаўрэатамі і дыпламантамі прэстыжных мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. За ўвесь перыяд існавання спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (з 1996 г.) студэнтамі і калектывамі БДУКМ было атрымана 101 заахвочванне. Сярод іх: гранд-прэмій з прысваеннем звання лаўрэата фонду – 10, стыпендый з прысваеннем стыпендыята фонду – 68, прэмій з прысваеннем звання дыпламанта фонду – 3, заахвочвальных прэмій – 20.

Па стане на 01.12.2010 г. у Адзіным рэспубліканскім электронным банку даных таленавітай моладзі знаходзяцца 49 прадстаўнікоў з ліку студэнтаў і выпускнікоў БДУКМ і 9 калектываў.

Сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце мае шматступеньчатую структуру, якая ўключае: рэктарат, дэканаты, кафедры, аддзел выхаваўчай работы з моладдзю, студэнцкі савет, ПА ГА «БРСМ», ПА РГА «Белая Русь», студэнцкі прафсаюз. З мэтай вывучэння, ацэнкі і перспектыўнага планавання выхаваўчай работы штогод праводзіцца маніторынг на розных узроўнях: кафедральным, факультэцкім, універсітэцкім.

Членамі ПА ГА «БРСМ» у 2009/10 г. лічацца 36,7%, студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі – 96,5%, пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» – 9% ад агульнай колькасці студэнтаў універсітэта.

Інтэнсіўна развіваецца студэнцкае самакіраванне, дзейнічаюць 7 студэнцкіх саветаў – універсітэта, 4 факультэтаў, 2 студэнцкіх інтэрнатаў. Усяго актыў студэнцкіх саветаў у 2009/10 г. склаў 9% ад агульнай колькасці студэнтаў.

У 2009/10 г. ва ўніверсітэце праведзена 545 мерапрыемстваў інфармацыйна-ідэалагічнай накіраванасці, 97 спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў і спаборніцтваў (68,1% ад агульнай колькасці студэнтаў). Пад кіраўніцтвам спартыўнага клуба студэнты ўдзельнічалі ў Зорных і турыстычных паходах, спартыўных акцыях – усяго ў 2009/10 навучальным годзе ажыццёўлена 48 мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел больш за 40% студэнтаў.

Забяспечанасць інтэрнатам у 2009/10 г. склала 89,7%.

У студэнцкіх інтэрнатах працуюць 23 клубныя фарміраванні, якія аб'ядноўваюць 13,2% студэнтаў.

Студэнты ўніверсітэта ў 2009/10 г. прынялі ўдзел у 1165 культурна-масавых мерапрыемствах на ўзроўні ўніверсітэта, горада, рэспублікі і на міжнародным узроўні.

У 2010 г. ва ўніверсітэце створаны комплекс, які ўключае: музей гісторыі ўніверсітэта, музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музей беларускіх народных інструментаў, музей рэдкай кнігі, галерэю славы «Культура як мазаіка імён». Выхаваўчы патэнцыял музейнага комплексу рэалізуецца ў рабоце з моладдзю – на яго базе праводзяцца мерапрыемствы па азнаямленні студэнтаў з гісторыяй універсітэта, кўратарскія гадзіны, практычныя заняткі, сустрэчы з народнымі майстрамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важная роля ў сістэме ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце адводзіцца выкладанню блока сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Выкладчыкамі праводзіцца актыўная работа па распрацоўцы і ўкараненні індывідуальных вучэбна-метадычных комплексаў як сістэмнага, універсальнага механізма рэалізацыі інавацыйных тэхналогій адукацыі і выхавання спецыялістаў. Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўніверсітэта зацверджаны крытэрыі якасці вучэбна-метадычнага комплексу, у адпаведнасці з якімі падрыхтаваны і выдадзены ВМК з грыфам Міністэрства адукацыі: у 2008 г. – «Паліталогія: навука аб палітыцы», у 2009 г. – «Асновы ідэалогіі Беларускай дзяржавы», у 2010 г. – «Культуралогія» і інш. (больш за 21 падручнік і вучэбны дапаможнік).

Наладжана сістэма ўзаемадзеяння з органамі ўнутраных спраў, дзейнічае студэнцкая добраахвотная дружына. Ажыццяўляецца аналіз узроўню правапарушэнняў сярод студэнтаў, а таксама прычын супрацьпраўных паводзін (за 2006 г. зарэгістраваны 4 правапарушэнні, за 2007–2010 гг. правапарушэнні не адзначаны).

Важным напрамкам сацыяльна-культурнай дзейнасці ўніверсітэта з’яўляецца арганізацыя і правядзенне фестываляў і конкурсаў міжнароднага і рэспубліканскага значэння. У 2008 г. у Мінску праводзіліся V маладзёжныя Дэльфійскія гульні, у якіх прынялі ўдзел каманды з 11 краін у 17 намінацыях. Для забеспячэння гульняў быў арганізаваны штаб з супрацоўнікаў універсітэта, наладжана работа студэнцкіх валанцёрскіх атрадаў. Якасць арганізацыі і правядзення V маладзёжных Дэльфійскіх гульняў атрымала высокую ацэнку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, актыўныя члены штаба адзначаны граматамі і падзякамі.

З 13 па 17 мая 2010 г. у Мінску праходзіў Фестываль культур народаў ЕўрАзЭС. У фестывалі прынялі ўдзел дэлегацыі Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь. Аргкамітэт фестывалю, які складаўся з супрацоўнікаў універсітэта, забяспечыў правядзенне праграмы мерапрыемстваў як у Мінску, так і ў абласцях рэспублікі. Сакратарыятам Інтэграцыйнага камітэта ЕўрАзЭС і Міністэрствам культуры ўзровень падрыхтоўкі і арганізацыі Фестывалю культур народаў ЕўрАзЭС быў прызнаны высокім і адзначаны граматамі і падзякамі.

Універсітэт таксама прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў «Зорка ўзышла над Беларуссю».

Адным з вырашальных фактараў развіцця ўніверсітэта з’яўляецца ступень фінансавага забеспячэння. Бюджэтныя асігнаванні скарачаюцца, у гэтых умовах універсітэт прыцягвае дадатковыя крыніцы фінансавання, самым стабільным з якіх з’яўляецца падрыхтоўка студэнтаў на платнай аснове. За перыяд з 2007 па 2009 г. даходы ад пазабюджэтнай дзейнасці ўзраслі на 208,3% і склалі 8 773,3 млн руб., у тым ліку ад паслуг адукацыі 6434,5 млн руб., або 73,3% ад агульнага аб’ёму.

Пазабюджэтныя даходы з’яўляюцца асноўнай крыніцай абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы і павышэння даходаў працоўнага калектыву. Так, напрыклад, на набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў за перыяд 2007–2009 гг. са сродкаў рэспубліканскага бюджэту выдзелена 300,6 млн руб., з пазабюджэтных сродкаў універсітэта – 2006,1 млн руб., што складае 86,7% ад агульнай сумы фінансавання.

На працягу 2007–2009 гг. сродкі, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці, накіроўваліся на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта, павышэнне заработнай платы супрацоўнікаў. Каэфіцыент абнаўлення вучэбна-матэрыяльнай і навукова-даследчай базы ў 2007 г. склаў 14,9%, у 2008 г. – 40,2%, у 2009 г. – 14,5%.

На абнаўленне вучэбна-матэрыяльнай і навукова-даследчай базы ўніверсітэта ў 2008 г. была накіравана асноўная доля даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці. Нездавальняючы стан вучэбных аўдыторый патрабаваў правядзення бягучага рамонту, і ў 2009 г. на гэтыя мэты накіравана 2764,6 млн руб., што дазволіла значна палепшыць умовы для навучання. Пазабюджэтныя выдаткі на аплату камунальных паслуг у 2009 г. склалі 330,3 млн руб., або 151,9% да ўзроўню 2007 г.

Сярэднямесячная заработная плата ў 2009 г. склала 1016,7 млн руб. і ўзрасла ў параўнанні з 2007 г. на 28,9%. Выдаткі на заработную плату супрацоўнікаў універсітэта за кошт пазабюджэтных сродкаў у 2009 г. склалі 1797,9 млн руб., або 152,4% да ўзроўню 2007 г. Акрамя таго, у 2009 г. на павышэнне заработнай платы накіравана са сродкаў фонду матэрыяльнага заахвочвання 912,7 руб., або 110,9% у параўнанні з 2007 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, аналіз дынамікі асноўных паказчыкаў, якія характарызуюць дзейнасць універсітэта, сведчыць аб яго стабільным устойлівым развіцці.

## III. СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА ПРАГРАМЫ

Місія ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» – падрыхтоўка высакакласных спецыялістаў, выхаванне інтэлектуальнай і мастацкай эліты грамадства на аснове інтэграцыі ў міжнародную адукацыйную прастору праз распаўсюджанне і замацаванне гуманістычных ідэалаў сусветнай культуры, захаванне і прымнажэнне традыцый нацыянальнай культурнай спадчыны. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», захоўваючы пазіцыі вядучай ВНУ рэспублікі ў галіне культуры і мастацтва, імкнецца атрымаць міжнароднае прызнанне і стаць інавацыйнай установай адукацыі, дзе спалучаюцца лепшыя акадэмічныя традыцыі і новыя ідэі, што забяспечваюць высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных да самарэалізацыі, гатовых да паспяховай прафесійнай дзейнасці ў сацыякультурнай сферы.

**Стратэгічнай мэтай Праграмы** з'яўляецца ўваходжанне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у сусветную эліту профільных універсітэтаў і комплекснае даследчае і адукацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь, што прадвызначае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў як:

– навукова-адукацыйны комплекс, які забяспечвае эфектыўную інтэграцыю навукова-даследчай, мастацка-творчай дзейнасці і праграм падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з высокім узроўнем гатоўнасці да самастойнай практычнай прафесійнай дзейнасці;

– установу вышэйшай адукацыі, прызнаную ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой, пацвярджаемую міжнароднымі рэйтынгамі;

– інтэлектуальны цэнтр, што распаўсюджвае свой пазітыўны вопыт у адукацыйнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, мастацка-творчай і выхаваўчай дзейнасці;

– аналітычны цэнтр, які выконвае дзяржаўныя заказы ў галіне інавацыйнага развіцця, навуковага, экспертнага забеспячэння сферы культуры.

## IV. ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ НАПРАМКІ І ЗАДАЧЫ ПРАГРАМЫ

З улікам прыярытэтаў, вызначаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, зацверджанай на IV Усебеларускім народным сходзе 8 снежня 2010 г., дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)», наяўнага інтэлектуальнага, кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага патэнцыялу, партнёрскіх сувязей у Беларусі і за мяжой, сучасных тэндэнцый у развіцці сусветнай навукі і ўніверсітэцкай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вылучаюцца наступныя прыярытэтныя кірункі сістэмнага развіцця:

– *адукацыйная дзейнасць;*
– *навуковая і інавацыйная дзейнасць;*
– *ідэалагічная і выхаваўчая работа з моладдзю;*
– *дзейнасць творчых калектываў;*
– *інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі;*
– *міжнародная дзейнасць;*
– *кадравае забеспячэнне і кіраўніцкія тэхналогіі;*
– *матэрыяльна-тэхнічная база і інфраструктура ўніверсітэта.*

Задачы Праграмы вызначаюць механізмы рэалізацыі прыярытэтных кірункаў праз сістэмнае развіццё ключавых рэсурсаў універсітэта, у тым ліку адукацыйных праграм, навуковых даследаванняў, інавацыйнай дзейнасці, а таксама інфраструктурнага комплексу і сістэм кіравання.

Развіццё кожнага прыярытэтнага кірунку павінна садзейнічаць мадэрнізацыі сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў і ўзнаўленню навуковых кадраў новага пакалення, вызначэнню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перспектыўных вектараў навуковых даследаванняў, захаванню, папулярызацыі і прымнажэнню духоўных багаццяў беларускага народа.

Развіццё прыярытэтных кірункаў прадугледжвае завяршэнне фарміравання сістэмы ўніверсітэцкай вучэбна-праграмнай дакументацыі, стандартаў і патрабаванняў, якія забяспечваюць нормы якасці падрыхтоўкі выпускнікоў і гарантуюць высокую прафесійную кваліфікацыю ўладальнікаў універсітэцкага дыплома, рост колькасці выпускнікоў вышэйшай кваліфікацыі, а таксама значнае развіццё акадэмічнай мабільнасці навучэнцаў і навукова-педагагічных работнікаў.

## IV.I. АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Сістэмная дынаміка адукацыйнай дзейнасці прадугледжвае распрацоўку і рэалізацыю комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё шматузроўневай адукацыі, якая спалучае сучасныя падыходы да зместу, вучэбна-метадычнага, тэхналагічнага і інфармацыйнага забеспячэння існуючых і распрацоўкі новых адукацыйных праграм. Канкрэтныя мерапрыемствы заснаваны на спалучэнні лепшага айчыннага і замежнага вопыту і грунтуюцца на пастаянным павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў і актыўным уцягванні навучэнцаў у навуковую дзейнасць.

Важнымі інструментамі эфектыўнай рэалізацыі сучасных адукацыйных праграм з'яўляюцца: распрацоўка і рэалізацыя новай палітыкі ў адукацыйнай дзейнасці; маніторынг запатрабаванасці адукацыйных праграм і выпускнікоў на айчынным і міжнародным рынках адукацыйных паслуг, а таксама міжнародныя акрэдытацыі адукацыйных праграм.

Для дасягнення стратэгічнай мэты Праграмы ў сферы адукацыйнай дзейнасці спатрэбіцца рашэнне наступных задач.

### *IV.I.I. Удасканаленне сістэмы вышэйшай адукацыі*

*Стратэгічная мэта* – удасканаленне сістэмы вышэйшай адукацыі за кошт узмацнення вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў, шырокага ўкаранення новых інфармацыйных тэхналогій, развіцця сістэмы бесперапыннай адукацыі.

*Віды дзейнасці.*

– Задавальненне попыту на высокакваліфікаваных спецыялістаў шляхам адкрыцця падрыхтоўкі па новых перспектыўных напрамках і спецыяльнасцях у галіне культуры.

– Абнаўленне і ўдасканаленне інавацыйных адукацыйных тэхналогій з выкарыстаннем прынцыпаў бесперапыннай шматузроўневай адукацыі: давузаўская падрыхтоўка, вышэйшая адукацыя (спецыялісты, магістры), паслявузаўская адукацыя (аспіранты, дактаранты), дадатковая адукацыя (другая вышэйшая адукацыя, павышэнне кваліфікацыі і прафесійная перападрыхтоўка, дадатковая кваліфікацыя). Стварэнне гібкай сістэмы ўзгаднення адукацыйных праграм рознага ўзроўню, што забяспечвае пашырэнне доступу да розных узроўняў адукацыі і высокую якасць падрыхтоўкі.

– Распрацоўка інавацыйных падыходаў да навучання. Комплекснае развіццё інфармацыйнага сэрвісу. Інтэнсіўнае ўкараненне адукацыйных і камунікатыўных інтэрнэт-тэхналогій, забеспячэнне электроннымі вучэбнымі матэрыяламі ўсіх дысцыплін. Узмацненне ролі самастойнай працы студэнтаў і ўдасканаленне кантролю ведаў студэнтаў на ўсіх этапах навучання на аснове інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, скарачэнне ў вучэбных планах аб'ёму аўдыторных заняткаў.

– Стварэнне рэсурсных цэнтраў як важных элементаў інфраструктуры для інавацыйнага развіцця і фарміравання сістэмы даступнасці інтэлектуальнага патэнцыялу ўніверсітэта дзеля рашэння адукацыйных, навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных задач – структурных падраздзяленняў, аснашчаных сучасным тэхнічным абсталяваннем:

– вучэбны рэсурсны цэнтр гуказапісу і аранжыроўкі праграм;

– міждысцыплінарны рэсурсны цэнтр у галіне мастацтвазнаўства і культуралогіі;

– вучэбны комплекс тэле- і радыёвяшчання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– цэнтр развіцця народных рамёстваў;
– вучэбны лінгафонны цэнтр;
– цэнтр прымянення вылічальнай тэхнікі ў гуманітарных даследаваннях.

– Удасканаленне сістэмы планавання вучэбнай нагрузкі і аплаты працы выкладчыкаў шляхам аптымізацыі вучэбнага працэсу паводле крытэрыю «якасць – затраты»; развіццё новых механізмаў фінансавання адукацыйнай дзейнасці падраздзяленняў. Стварэнне эфектыўнай сістэмы кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу ўніверсітэта. Стварэнне ўмоў для замацавання маладых выкладчыкаў і абнаўленне праграм павышэння кваліфікацыі.

– Умацаванне пазіцый універсітэта на міжнародным рынку адукацыйных паслуг праз удасканаленне адукацыйных праграм. Распрацоўка праграм падрыхтоўкі магістраў на замежных мовах. Прадастаўленне больш шырокіх магчымасцей студэнтам у вывучэнні замежных моў.

### *IV.I.II. Удасканаленне інфармацыйнага суправаджэння адукацыйнага працэсу*

*Стратэгічная мэта* – удасканаленне інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнага працэсу і дасягненне новай якасці адукацыйнай дзейнасці за кошт укаранення новых інфармацыйных тэхналогій.

*Віды дзейнасці.*

– Дасягненне поўнай забяспечанасці сучаснай вучэбнай і навуковай літаратурай, у тым ліку – на электронных носьбітах.

– Развіццё і ўдасканаленне карпаратыўнай сеткі ўніверсітэта.

– Рэалізацыя і падтрымка сістэмы аддаленага доступу, што забяспечвае аўтарызаваны доступ да інфармацыі, неабходнай у вучэбным працэсе, і пашырэнне магчымасці доступу да фондаў сусветных культурных каштоўнасцей у сетцы Інтэрнэт, стварэнне ўмоў для развіцця дыстанцыйнага навучання.

– Стварэнне мультымедыйных адукацыйных рэсурсаў; фарміраванне сістэмы вучэбных паточных аўдыторый, аснашчаных тэхнічнымі сродкамі мультымедыя.

– Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і іншых катэгорый работнікаў у галіне выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе для рэалізацыі інавацыйных праграм, стварэння і выкарыстання электроннага забеспячэння вучэбнага працэсу ў адпаведнасці з патрабаваннямі ГОСТ 7.83 – 2001, якія прад’яўляюцца да электронных выданняў.

– Распрацоўка механізма падтрымкі выкладчыкаў, якія ствараюць і ўкараняюць у методыку выкладання электронныя вучэбныя рэсурсы.

– Стварэнне вучэбна-метадычных распрацовак па інфармацыйным суправаджэнні адукацыйнага працэсу.

### *IV.I.III. Арганізацыя міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі*

*Стратэгічная мэта* – умацаванне аўтарытэту ўніверсітэта на міжнароднай арэне і дасягненне статусу міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра.

*Віды дзейнасці.*

– Актывізацыя прапаганды дасягненняў і магчымасцей універсітэта ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай дзейнасці праз удзел у міжнародных выстаўках, арганізацыю інтэрнэт-канферэнцый па навуковых, адукацыйных і метадычных праблемах, публікацыі ў вядучых сусветных выданнях.

– Развіццё партнёрскіх сувязей з вядучымі замежнымі адукацыйнымі і навуковымі цэнтрамі праз удзел у міжнародных праграмах і праектах, акадэмічныя абмены студэнтамі, выкладчыкамі, аспірантамі.

– Забеспячэнне ўзаемнага прызнання адукацыйных праграм у партнёрскіх ВНУ. Стварэнне ўмоў для экспарту адукацыйных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## IV.II. НАВУКОВАЯ І ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Інструментамі павышэння эфектыўнасці правядзення навуковых даследаванняў стануць стварэнне сістэмы планавання і падтрымкі навуковай і інавацыйнай дзейнасці, заснаванай на аб’ектыўных навукаметрычных паказчыках, а таксама аптымізацыя і пашырэнне працэдур конкурсаў для вызначэння прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў.

Маніторынг развіцця сучаснай навукі і ўключэнне ўніверсітэцкіх вучоных у работу па перспектыўных навуковых напрамках прывядуць да пашырэння кола партнёраў сярод універсітэтаў, навуковых цэнтраў і інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама да павышэння актыўнасці ў міжнародных даследчых праектах.

Ключавымі ў гэтай сферы з’яўляюцца: фарміраванне супольнасці ўніверсітэцкіх экспертаў у галінах ведаў, паводле якіх ва ўніверсітэце здзяйсняюцца навуковая і адукацыйная дзейнасць; распрацоўка методык правядзення экспертыз з выкарыстаннем навуковага патэнцыялу ўніверсітэта; распрацоўка і рэалізацыя адукацыйных праграм прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі экспертаў. Рашэнне гэтых пытанняў дазволіць Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў выконваць функцыі экспертнай установы для Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэгіянальных органаў улады, зацікаўленых устаноў і арганізацый.

Сістэмнае развіццё навукова-інавацыйнай дзейнасці прадугледжвае:

– удасканаленне сістэмы планавання і падтрымкі навуковай і інавацыйнай дзейнасці;

– распрацоўку і рэалізацыю падыходаў да актуалізацыі тэматыкі даследаванняў у фундаментальнай і прыкладной навуцы;

– развіццё інавацыйнай дзейнасці;

– пашырэнне ўнутрыдзяржаўнай і міжнароднай кааперацыі ў навуковай дзейнасці;

– развіццё ўніверсітэцкай экспертнай супольнасці.

Для дасягнення стратэгічнай мэты Праграмы ў сферы навукова-інавацыйнай дзейнасці патрабуецца рашэнне наступных задач.

### *IV.II.I. Удасканаленне навуковай дзейнасці на шляху інавацыйнага развіцця*

*Мэта* – прапанаваць канструктыўныя ідэі і прынцыпы развіцця навукова-інавацыйнай дзейнасці ўніверсітэта, стварыўшы перадумовы для бесперапыннага павышэння ўзроўню навукова-метадычнага і навукова-тэхнічнага забеспячэння якасці адукацыі.

Навукова-інавацыйнае *развіццё* Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прадугледжваецца па трох кірунках:

– генерыраванне новых ідэй для карэкціроўкі культурнай палітыкі;

– стварэнне новых ведаў аб культуры для навукі і адукацыі;

– падрыхтоўка спецыялістаў з новымі прафесійнымі кампетэнцыямі для працы ў розных галінах сферы культуры.

Навукова-інавацыйная *дзейнасць* вызначаецца трыма важнейшымі кірункамі:

– навуковае, навукова-метадычнае і навукова-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу;

– навукова-даследчая работа;

– стварэнне рыначна-арыентаваных механізмаў рэалізацыі інавацыйных ідэй і праектаў, якія прадугледжваюць стварэнне канкурэнтаздольнага рыначнага прадукту.

Пры выбары прыярытэтаў, што тычацца навуковых напрамкаў дзейнасці ўніверсітэта, трэба ўлічваць патрэбнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у правядзенні прыкладных даследаванняў (у тым ліку даследаванняў апераджальнага характару) для фарміравання збалансаванай культурнай палітыкі.

### *IV.II.II. Выкананне заданняў раздзела «Навуковае забеспячэнне сферы культуры» дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Галоўная мэта* дзяржаўнай праграмы – павышэнне сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці функцыянавання галіны культуры.

*Задача* раздзела «Навуковае забеспячэнне сферы культуры» дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)» заключаецца ў правядзенні навуковых даследаванняў фундаментальнага і прыкладнога характару па актуальных пытаннях развіцця сферы культуры. Да прыярытэтных даследаванняў належыць аднесці *прыкладныя* даследаванні, накіраваныя на стварэнне і ўдасканаленне навукова абгрунтаваных механізмаў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, у тым ліку:

– вызначэнне ўздзеяння культуры на ўсе сферы грамадскага жыцця, уключаючы эканоміку;

– вызначэнне асаблівасцей дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры ў эпоху глабалізацыі;

– стварэнне аптымальных сацыякультурных умоў развіцця асобы;

– правядзенне даследаванняў, звязаных з рэалізацыяй праектаў па вывучэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны;

– здзяйсненне даследаванняў па пытаннях сацыякультурнага праектавання, развіцця індустрыі культуры, распрацоўкі і ўдасканалення маркетынгавых стратэгій прасоўвання прадуктаў і паслуг у сферы культуры;

– правядзенне сацыялагічных даследаванняў у сферы культуры.

### *IV.II.III. Выкананне планавых навуковых тэм калектывамі кафедраў універсітэта*

У перыяд з 2011 па 2015 г. у адпаведнасці з планам навукова-даследчых работ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па тэме «Культурная бяспека ва ўмовах глабалізацыі: дзейнасць устаноў культуры Рэспублікі Беларусь па захаванні культурнай спадчыны» запланаваны даследаванні па наступных навуковых кірунках:

– нацыянальная культура Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі;

– захаванне нацыянальнага мастацтва ва ўмовах глабалізацыі;

– дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь па захаванні і распаўсюджанні дакументальнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі;

– сацыякультурная дзейнасць і захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны;

– даследаванне і выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у навучальным працэсе ва ўмовах глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *IV.II.IV. Забеспячэнне функцыянавання навуковых школ*

Работа навуковых школ у новым пяцігоддзі прадвызначае пашырэнне і актуалізацыю тэматыкі праводзімых даследаванняў у адпаведнасці з прыярытэтнымі кірункамі развіцця нацыянальнай культуры.

Навуковая школа ў галіне культуралогіі «Сусветная і айчынная культура» ў будучай пяцігодцы завяршыць даследаванні па этнагенезе і культуры беларусаў, этнакультурным памежжы і беларускай ідэнтычнасці ва ўмовах глабалізацыі. Будзе працягнута работа па праблемах культуры гендэрных адносін у Беларусі, трансфармацыі статусу рэлігійнасці ў культуры інфармацыйнага грамадства і інш.

У рамках дзейнасці навуковай школы ў галіне педагогікі «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» будзе працягнута даследаванне такіх праблем, як развіццё крэатыўнасці школьнікаў і студэнтаў сродкамі сацыякультурнай дзейнасці, захаванне нацыянальнай культурна-даследчай спадчыны, падрыхтоўка спецыялістаў культурна-стваральнай і культурна-ахоўнай дзейнасці ва ўстановах культуры, фарміраванне экалагічнай культуры асобы і інш.

У рамках дзейнасці навуковай школы ў галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» будуць праводзіцца даследаванні па гісторыі беларускай бібліяграфіі, па пашырэнні інфармацыйнай культуры асобы, падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў і г.д.

Навуковая школа ў галіне мастацтвазнаўства «Кампаратыўнае мастацтвазнаўства» будзе працягваць канцэптуалізацыю тэарэтычных і метадалагічных праблем новай навуковай галіны – кампаратыўнае мастацтвазнаўства, у рамках якой мяркуецца разглядаць стратэгіі развіцця тэхнагеннага, экраннага, музычна-тэатральнага мастацтва, а таксама сучасных візуальна-мастацкіх практык.

### *IV.II.V. Функцыянаванне саветаў па абароне дысертацый і праблемных саветаў*

На працягу 2011–2015 гг. плануюцца абароны 42 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый. Саветы па абароне дысертацый з'яўляюцца важным кампанентам сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, накіраваным на ўзнаўленне і нарошчванне інтэлектуальнага патэнцыялу прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта.

Галоўныя задачы дысертацыйных саветаў на будучую пяцігодку:

– правядзенне аб'ектыўнай і кваліфікаванай экспертызы дысертацыі;

– правядзенне пераатэстацыі ўладальнікаў кваліфікацыйных дакументаў аб вучонай ступені, выдадзеных у замежных дзяржавах;

– разгляд пытанняў пазбаўлення (аднаўлення) вучонай ступені.

Асноўныя задачы, якія ўскладваюцца на праблемныя саветы ўніверсітэта:

– забяспечыць выкананне навуковых прац у рамках зацверджанай тэматыкі навуковых даследаванняў па каардынуемай праблеме;

– уносіць прапановы па перспектыўных навуковых даследаваннях;

– абмяркоўваць справаздачы аб ходзе выканання НДР;

– здзяйсняць экспертызу вынікаў навуковай дзейнасці;

– абмяркоўваць рукапісы падрыхтаваных профільных выданняў для выпрацоўкі рэкамендацыі да друку;

– праводзіць работу па апаніраванні дысертацыйных даследаванняў, накіраваных ва ўніверсітэт з іншых ВНУ рэспублікі.

### *IV.II.VI. Арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў (НДРС), удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых прац*

У 2011–2015 гг. плануецца развіваць практыку куратарства таленавітых студэнтаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай дзейнасці, вядучымі вучонымі і спецыялістамі. Асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца адбору будучых аспірантаў з ліку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лепшых студэнтаў 2–3-х курсаў усіх факультэтаў. Пры гэтым павінна захоўвацца пераемнасць зместу курсавых і дыпломных прац, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Правядзенне штогадовых навуковых канферэнцый студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў павінна завяршацца публікацыяй лепшых дакладаў.

Будзе працягвацца работа студэнцкіх навуковых гурткоў і аб'яднанняў.

Перспектывы развіцця НДРС будуць звязаны з:

– больш інтэнсіўным стымуляваннем навукова-даследчай і самастойнай работы студэнтаў;

– устанаўленнем кантактаў з рэдакцыямі навукова-практычных часопісаў з мэтай апублікавання вынікаў НДРС;

– прыцягненнем студэнтаў да ўдзелу ў навуковых канферэнцыях, у рабоце Савета маладых вучоных Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;

– стварэннем міжкафедральных навуковых суполак.

Актыўнаму ўключэнню лепшых студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў у навукова-даследчую дзейнасць будзе садзейнічаць уцягванне іх у работу над комплекснымі навукова-даследчымі тэмамі кафедраў і выкананне заданняў дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)» і навукова-даследчых тэм НТЛ універсітэта.

### *IV.II.VII. Арганізацыя работы Савета маладых вучоных універсітэта*

Асноўнымі мэтамі дзейнасці Савета маладых вучоных з'яўляюцца: актывізацыя прафесійнага росту маладых вучоных; аб'яднанне іх намаганняў для распрацоўкі актуальных навуковых праблем і рашэння прыярытэтных навуковых задач, а таксама развіцця інавацыйнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі новага пяцігоддзя з'яўляюцца:

– прапаганда навейшых дасягненняў навукі ў асяроддзі моладзі;

– стварэнне ўмоў для прафесійнага росту і павышэння сацыяльнай актыўнасці маладых вучоных;

– удасканаленне формаў удзелу маладых вучоных у даследчых праектах, навуковых грантах, школах, конкурсах, праграмах, стажыроўках, у распрацоўках фундаментальных і прыкладных даследаванняў;

– фарміраванне і пашырэнне сеткі кантактаў з саветамі маладых вучоных іншых навуковых арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў;

– папулярызацыя выдатных дасягненняў маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта.

### *IV.II.VIII. Удасканаленне выдавецкай дзейнасці*

Прыярытэтныя задачы ў галіне выдавецкай дзейнасці ў будучым пяцігоддзі:

– удасканаленне выдавецкай дзейнасці ў мэтах забеспячэння ўмоў далейшага развіцця беларускай навукі і культуры;

– укараненне навейшых тэхналогій дадрукарскай падрыхтоўкі і паліграфіі, павышэнне выяўленчай і зместавай культуры выданняў;

– павышэнне даходнасці рэдакцыйна-выдавецкага комплексу;

– стварэнне механізма акупнасці выдавецкіх праектаў, выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

## IV.III. ІДЭАЛАГІЧНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА З МОЛАДДЗЮ

Вышэйшая навучальная ўстанова аказвае значны ўплыў на ўмацаванне духоўнага і інавацыйнага патэнцыялу беларускага грамадства. Грамадзянскія, асобасныя якасці выпускнікоў універсітэта, іх прафесійная кампетэнтнасць, светапогляд і каштоўнасныя арыентацыі аказваюць непасрэднае ўздзеянне на масавае ўсведамленне і паводзіны, з'яўляюцца важнай перадумовай духоўна-маральнага здароўя і дабрабыту дзяржавы.

Сістэма ідэалагічнай работы ва ўніверсітэце ўяўляе сукупнасць кіраўніцкіх структур, службовых асоб, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, грамадскіх арганізацый і органаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнцкага самакіравання, адносін і дзеянняў, каштоўнасных імператываў, функцый, нормаў і рэсурсаў, якія забяспечваюць практычнае вырашэнне ідэалагічных, культурна-выхаваўчых задач. Суб'екты ідэалагічнага працэсу надзелены ва ўстаноўленым парадку паўнамоцтвамі згодна з кампетэнцыяй і роляй у механізме ідэалагічнага ўплыву на ўсведамленне і паводзіны студэнтаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў і супрацоўнікаў універсітэта.

### *IV.III.I. Прынцыпы арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Палітыка ўніверсітэта ў сферы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце паходзіць з пераемнасці мэт і прыярытэтаў, што былі сфарміраваны і рэалізоўваліся ў папярэднія гады. Асноватворнымі прынцыпамі работы ў будучым пяцігоддзі будуць:

– арганізацыя грамадзянскага выхавання студэнтаў на падставе ідэй і каштоўнасцей, што складаюць змест ідэалогіі беларускай дзяржавы;

– далучэнне студэнтаў да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, стваральнай творчасці з улікам ідэалагічных фактараў, гісторыка-культурных традыцый і асаблівасцей менталітэту беларускага народа;

– строгае выкананне палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншых нарматыўных прававых актаў, рэгулюючых адносіны ў сістэме вышэйшай адукацыі;

– адзінства адукацыйных і выхаваўчых задач;

– дэмакратычнасць узаемадзеяння педагогаў і студэнтаў, якая выяўляецца ў даверы, узаемадапамозе, садружнасці, партнёрстве, плюралізме думак і перакананняў;

– стварэнне рэальных умоў, выхаваўчага асяроддзя, якія садзейнічаюць зніжэнню колькасці правапарушэнняў, што перашкаджае распаўсюджанню ў асяроддзі моладзі негатыўных сацыяльных з'яў;

– задавальненне духоўна-маральных запытаў асобы з улікам індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей.

У кантэксце стратэгічнай мэты Праграмы развіцця ўніверсітэта на 2011–2015 гг. сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце прызвана садзейнічаць:

– усведамленню студэнтамі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі, кіраўнікамі значнасці ідэалогіі дзяржавы як сродку якаснай, цывілізаванай, стратэгічна і тэхналагічна абгрунтаванай перабудовы ўсіх сфер жыцця беларускага грамадства;

– ператварэнню ў жыццё ідэі, апрабаванай практыкай сацыяльнай трансфармацыі: «Моцная дзяржава – квітнеючая Беларусь»;

– засваенню кожным студэнтам ролі духоўна-ідэалагічных фактараў у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, сацыяльным кіраванні, самаразвіцці і задавальненні патрабаванняў асобы;

– стварэнню сістэмы выхаваўчых, гэта значыць сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і арганізацыйных мер, накіраваных на выяўленне, устараненне ці нейтралізацыю прычын і ўмоў, што садзейнічаюць правапарушэнням, на вядзенне актыўнай барацьбы з антыграмадскімі паводзінамі, перавыхаванне парушальнікаў сацыяльных нормаў;

– павышэнню якасці адукацыі, сацыяльна-асобаснай кампетэнтнасці выпускнікоў універсітэта, іх здольнасці дзейнічаць у бесперапынна зменлівых умовах з пазіцый інтарэсаў нацыянальнай дзяржаўнасці.

### *IV.III.II. Мэта і задачы ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Асноўнымі мэтамі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце з'яўляюцца: фарміраванне эфектыўнай сістэмы грамадзянскага выхавання студэнтаў універсітэта; забеспячэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва, адэкватнай нацыянальным інтарэсам, выклікам і запатрабаванням веку, інфармацыі, высокім тэхналогіям, зменам у сучасным свеце.

*Задачы* ідэалагічнай і выхаваўчай работы на будучае пяцігоддзе:

– стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць студэнцкай моладзі глыбокае авалоданне духоўна-ідэалагічнымі каштоўнасцямі і палітыкай беларускай дзяржавы, падахвочваючых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобу да адказных учынкаў, добрасумленнага выканання прафесійнага абавязку, гуманных адносін да людзей, творчай працы, усвядомленага выбару здаровага ладу жыцця;

– рэалізацыя комплексу мер, накіраваных на фарміраванне сацыяльна эфектыўнай сістэмы ідэалагічнай работы, яе інфармацыйна-аналітычнае, кадравае і метадычнае забеспячэнне;

– мэтанакіраванае фарміраванне ўменняў прадуктыўнага выкарыстання атрыманых ідэалагічных ведаў і навыкаў у прафесійнай дзейнасці і міжасобасных зносінах;

– выхаванне ў кожнага будучага спецыяліста ў галіне культуры непрымання нацыяналістычных, экстрэмісцкіх і іншых дэструктыўных поглядаў і дзеянняў, што наносяць шкоду інтарэсам дзяржавы і грамадства;

– удзел прафесарска-выкладчыцкага складу ў фарміраванні і навуковым развіцці ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, абгрунтаванні тэхналогій яе практычнай рэалізацыі ў сферы нацыянальнай культуры.

### *IV.III.III. Механізм рэалізацыі задач ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Рэалізацыя задач Праграмы ў сферы ідэалагічнай і выхаваўчай работы забяспечваецца праз:

– растлумачэнне студэнтам, выкладчыкам, супрацоўнікам, кіраўнікам метадамі пераканальнай камунікацыі ідэалогіі і палітыкі дзяржавы;

– планамернае і сістэматычнае інфармаванне калектыву ўніверсітэта аб найбольш важных падзеях у свеце і краіне, палітычных, эканамічных мерах кіраўніцтва рэспублікі па вырашэнні грамадскіх праблем, сацыяльнай эфектыўнасці інстытутаў дзяржаўнай улады;

– арганізацыю і правядзенне тэматычных сустрэч калектыву ўніверсітэта з членамі ўрада, дэпутатамі, знанымі вучонымі, кіраўнікамі вытворчасці, дзеячамі мастацтва і культуры;

– прадстаўленне выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў за канкрэтныя вынікі сацыяльна карыснай дзейнасці да дзяржаўных, ведамасных узнагарод і падтрымкі, прыняцце іншых мер матэрыяльнага і маральнага стымулявання добрасумленнай працы;

– арганізацыю ўрачыстых мерапрыемстваў у сувязі з дзяржаўнымі і прафесійнымі святамі, ушанаваннем членаў калектыву, юбілейнымі і іншымі знамянальнымі датамі ў жыцці рэспублікі і ўніверсітэта;

– рэалізацыю мер па падвышэнні ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту супрацоўнікаў і пенсіянераў, паляпшэнні іх жыллёвых умоў, медыцынскага абслугоўвання, санаторнага лячэння, сацыяльнай абароне членаў сям'і;

– арганізацыю і правядзенне ў рамках дзяржаўна-патрыятычнага, прафесійна-працоўнага, маральна-эстэтычнага выхавання культурна-дасугавых, фізкультурна-аздараўленчых і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на прапаганду здаровага ладу жыцця сярод студэнтаў і работнікаў універсітэта.

Механізм рэалізацыі Праграмы прадугледжвае планамернае развіццё ў струдэнтаў пазітыўных асобасных якасцей, засваенне імі дзяржаўных інтарэсаў, прыярытэтаў і каштоўнасцей як матываў паўсядзённых паводзін і прафесійнай дзейнасці.

### *IV.IV. Дзейнасць мастацкіх калектываў*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў арганізуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з класічнымі падыходамі ўніверсітэцкай адукацыі на аснове прынцыпаў адзінства адукацыйнай, навуковай і творчай дзейнасці, сувязі навукова-педагагічнага працэсу з практыкай. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, асноўнымі задачамі ў галіне творчай дзейнасці ўніверсітэта трэба лічыць:

– удасканаленне і набыццё студэнтамі прафесійных уменняў і навыкаў;

– рэалізацыю створаных падчас адукацыйнага працэсу праграм і творчых праектаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– апрабацыю і асваенне культурна-дасугавых тэхналогій, новых методык мастацка-творчай дзейнасці.

Эфектыўная і апрабаваная практыкай форма станаўлення паўнавартаснай творчай асобы – удзел у студэнцкіх мастацкіх калектывах, асноўнымі задачамі дзейнасці якіх вызначаюцца:

– задавальненне патрэбнасцей асобы ў атрыманні вышэйшай адукацыі, яе інтэлектуальным, маральным, культурным развіцці на аснове адзінства вучэбнага працэсу і мастацка-творчай дзейнасці;

– культурна-дасугавае абслугоўванне насельніцтва;

– актыўная канцэртная дзейнасць, накіраваная на эстэтычнае выхаванне і прапаганду дасягненняў нацыянальнай культуры.

Механізмам рашэння пастаўленых задач і падвышэння эфектыўнасці канцэртнай дзейнасці мастацкіх калектываў з'яўляецца комплексная маркетынгавая стратэгія творчай дзейнасці ўніверсітэта, якая ўключае:

– правядзенне даследаванняў па вывучэнні патэнцыяльных і фактычных арт-рынкаў, вопыту іх работы, выяўленне і аналіз дынамікі попыту на сацыякультурныя паслугі;

– распрацоўку, абгрунтаванне мэтазгоднасці рэалізуемых творчых праектаў, накіраваных на фарміраванне сацыяльна значных культурна-эстэтычных каштоўнасцей;

– аптымізацыю камерцыйнай дзейнасці ў сферы культуры і мастацтва, у тым ліку для паступовага пераходу мастацкіх калектываў на самаакупнасць;

– стварэнне і актуалізацыю камплекта прадстаўнічай і рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі мастацкіх калектываў універсітэта (аўдыявізуальная, друкаваная і іншая прома-прадукцыя);

– прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання творчых праектаў, стымуляванне суб'ектаў па прыцягненні спонсараў, мецэнатаў, партнёраў, прамоўтараў.

### *IV.V. Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі*

У кантэксце Праграмы развіцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мэтай інфарматызацыі з'яўляецца стварэнне аптымальных умоў для падвышэння якасці адукацыі, навуковай і творчай дзейнасці, работы кіраўніцкіх структур шляхам укаранення ў практыку, суправаджэння і развіцця інфармацыйных сістэм і тэхналогій.

У будучым пяцігоддзі мяркуецца рашэнне практычных задач інфарматызацыі па асноўных напрамках дзейнасці ўніверсітэта.

### *IV.V.I. Інфарматызацыя вучэбнага працэсу*

Інфарматызацыя вучэбнага працэсу з'яўляецца прыярытэтнай мэтай, якая забяспечвае якасна новы ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў усіх напрамкаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Галоўныя задачы ў галіне інфарматызацыі вучэбнага працэсу:

– шырокае ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у вучэбны працэс;

– удасканаленне інфармацыйнага абслугоўвання, рэгулярнае абнаўленне парку тэхнічных сродкаў навучання;

– распрацоўка, набыццё, укараненне праграмнага забеспячэння для стварэння электронных вучэбных матэрыялаў, развіццё новых формаў і метадаў выкладання з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій (у тым ліку дыстанцыйнай адукацыі).

Для рашэння гэтых задач неабходна:

– паэтапна фарміраваць сучасную праграмна-тэхнічную базу ўніверсітэта;

– прадоўжыць стварэнне і наступнае напаўненне сайтаў факультэтаў неабходнай інфармацыяй для забеспячэння вучэбнага працэсу: вучэбныя планы па спецыяльнасцях, тыпавыя і вучэбныя праграмы, праграмы практыкі, метадычнае забеспячэнне курсаў (электронныя вучэбныя матэрыялы па дысцыплінах);

– прадоўжыць напаўненне электронных адукацыйных баз даных (база інфармацыйных рэсурсаў);

– стварыць кансультацыйную групу па тэхнічным садзейнічанні прафесарска-выкладчыцкаму складу ў стварэнні электронных падручнікаў, дапаможнікаў, кантралюючых праграм;

– прадоўжыць укараненне інфармацыйнай сістэмы падтрымкі самастойнай работы студэнтаў, прадугледзець магчымасці абмену электроннымі вучэбнымі матэрыяламі, тэсціраванне, кантроль выканання планаў праходжання дысцыплін, кансультацыйную падтрымку з выкарыстаннем тэхналогій дыстанцыйнай адукацыі.

### *IV.V.II. Інфарматызацыя навуковай дзейнасці*

Інфарматызацыю навуковай дзейнасці належыць весці наступным чынам:

– пастаянна абнаўляць раздзел сайта «Навука» ва ўніверсітэце з абавязковым увядзеннем раздзелаў: «Банк даных навуковых і навукова-практычных канферэнцый, семінараў», «Дэпазітарый навуковых работ выкладчыкаў, супрацоўнікаў і аспірантаў»;

– адпрацаваць тэхналогію камерцыялізацыі навуковых распрацовак (стварыць базу даных інавацыйных праектаў і крыніц іх фінансавання);

– стварыць базу даных аспірантаў, суіскальнікаў і дактарантаў універсітэта.

### *IV.V.III. Развіццё аўтаматызаваных сістэм*

Мэта інфарматызацыі ў гэтай сферы – удасканаленне арганізацыйных формаў і метадаў кіравання рознымі працэсамі ўніверсітэта на ўсіх узроўнях шляхам развіцця аўтаматызаваных сістэм кіравання.

Развіццё аўтаматызаваных сістэм павінна забяспечыць рашэнне практычных *задач:*

– фарміраванне інфармацыйных, арганізацыйна-кіраўніцкіх і нарматыўных баз даных;

– забеспячэнне на рабочым месцы кіраўнікоў універсітэта, факультэтаў, кафедраў, лабараторый, кіраўніцкіх службаў і іншых структурных падраздзяленняў інфармацыяй, неабходнай і дастатковай для прыняцця аптымальных рашэнняў на сваім узроўні;

– аўтаматызацыя часткі кіраўніцкай дзейнасці, звязанай з выкананнем руцінных аперацый, а таксама рашэннем задач аўтаматызацыі стандартных службовых аперацый, інфармацыйнай падтрымкі функцыянавання ВНУ і яго падраздзяленняў, планавання і справаздачнасці.

Для рэалізацыі пастаўленых задач мяркуецца стварыць і ўкараніць адкрытую інфармацыйна-даведачную базу ўніверсітэта, якая ўключае раздзелы:

– электронныя варыянты тыпавых узораў улікова-справаздачных дакументаў універсітэта (па вучэбна-выхаваўчай рабоце і навуцы) з адпаведнымі інструкцыямі і патрабаваннямі;

– нарматыўныя дакументы Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры;

– навукова-даследчая работа;

– інфармацыйна-даведачная база СМК;

– падсістэма «Разлік нагрузкі»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– падсістэма «Электронны расклад»;
– падсістэма «Электронны дакументаабарот»;
– падсістэма па ўліку, рэгістрацыі, выдачы пластыкавых дакументаў на аснове смарт-карт «Смарт-дакумент»;
– падсістэма «Кіраванне ўніверсітэтам», якая ўключае сістэму «Студэнты».

### *IV.V.IV. Развіццё электроннай бібліятэкі*

Мэта інфарматызацыі бібліятэкі – падвышэнне якасці інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі за кошт новых інфармацыйных тэхналогій, заснаваных на прымяненні электронных тэхнічных сродкаў.

На будучы перыяд акрэслены наступныя *задачы*:

– інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў шляхам прадастаўлення аддаленага доступу да інфармацыі аб бібліятэчных фондах універсітэта;
– аўтаматызацыя працэсу кнігавыдачы;
– фарміраванне паўнатэкставых электронных калекцый.

Для рашэння гэтых задач мяркуецца:

– завяршыць аўтаматызацыю працэсу кнігавыдачы: набыць абнаўленне для АБІС МАРК-SQL; набыць і ўкараніць сістэму, заснаваную на RFID тэхналогіі, для арганізацыі электроннай выдачы/вяртання кніг на абанеменце вучэбнай літаратуры;
– удасканальваць інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі: змясціць на сайце бібліятэкі электронны каталог, арганізаваць сістэму электроннага заказу літаратуры; прадаставіць супрацоўнікам універсітэта аддалены доступ да электроннага каталогу бібліятэкі і наяўным паўнатэкставым базам даных;
– сфарміраваць паўнатэкставыя электронныя калекцыі: стварыць Цэнтр аблічбоўкі для электронных паўнатэкставых калекцый; сфарміраваць Базу даных паўнатэкставых калекцый навуковых прац супрацоўнікаў універсітэта па напрамках; сфарміраваць паўнатэкставую Базу даных вучэбна-метадычных дапаможнікаў універсітэта.

### *IV.V.V. Развіццё тэлекамунікацыйнай інфраструктуры*

Асноўнымі мэтамі развіцця тэлекамунікацыйнай інфраструктуры з’яўляецца павелічэнне ёмістасці наяўных і пабудовы новых каналаў перадачы даных для падвышэння якасці і пашырэння спісу прадастаўляемых паслуг.

Для дасягнення гэтых мэт неабходна рашыць задачы:

– развіцця ЛВС універсітэта на аснове тэхналогіі Wi-Fi;
– павелічэння прапускной здольнасці знешняга канала доступу ў Інтэрнэт.

### *IV.V.VI. Развіццё аддзела тэхнічных сродкаў навучання*

Адным з найбольш перспектыўных напрамкаў у адукацыі з’яўляецца прымяненне камп’ютарных тэхналогій. Укараненне ТСН у вучэбны працэс патрабуе рашэння наступных задач:

– набыццё сучасных тэхнічных сродкаў навучання і абсталяванне імі вучэбных аўдыторый універсітэта;
– павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў аддзела;
– фарміраванне сучасных комплексаў ТСН;
– стварэнне электроннага каталогу тэхнічных сродкаў, прадастаўляемых аддзелам ТСН, для забеспячэння вучэбнага працэсу;
– завяршэнне работ па кадзіраванні аналагавых аўдыя- і відэаматэрыялаў, прадастаўленых у лічбавым фармаце;
– стварэнне электроннага каталогу лічбавага аўдыя-, відэафонду.

### *IV.V. VII. Развіццё інтэрнэт-рэсурсу ўніверсітэта*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтай стварэння спецыялізаванага інтэрнэт-рэсурсу адкрытага доступу з’яўляецца садзейнічанне фарміраванню і ўмацаванню партнёрскіх адносінаў і сувязей паміж універсітэтам і грамадскасцю, у тым ліку і патэнцыяльнымі дабрачынцамі (выпускнікамі, бацькамі навучэнцаў, спонсарамі). Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна рашэнне наступных *задач*:

– стварэнне раздзела «Рэсурсы» на сайце ўніверсітэта з доступам па спасылках да інфармацыі аб агульнаадукацыйных установах у сферы культуры, асаблівасцях іх функцыянавання і развіцця;

– азнаямленне наведвальнікаў сайта з нарматыўна-прававымі дакументамі, якія тычацца юрыдычнага і фінансавага боку дабрачыннай дзейнасці;

– інфармаванне грамадскасці аб дабрачыннай дзейнасці і практыцы партнёрскіх адносінаў паміж вучэбнымі ўстановамі і іх выпускнікамі ў рэспубліцы і за мяжой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *IV.V.VIII. Развіццё праграмна-тэхнічнага комплексу*

Развіццё праграмна-тэхнічнага комплексу – гэта адзін з асноўных кампанентаў інфарматызацыі. У гэтым напрамку найбольш актуальныя наступныя *задачы*:

– павелічэнне колькасці камп’ютараў, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе і сістэме кіравання ВНУ, своечасовае абнаўленне ўстарэлай тэхнікі;

– развіццё лакальнай сеткі ўніверсітэта; прадугледжваецца падключэнне ў лакальную сетку 2-га вучэбнага корпуса, студэнцкіх інтэрнатаў;

– забеспячэнне ўсіх напрамкаў дзейнасці ўніверсітэта неабходным і дастатковым наборам ліцэнзійных праграмных прадуктаў, уключна набыццё дадатковай колькасці ліцэнзій і абнаўленне ўжо набытых ліцэнзійных праграмных прадуктаў;

– паслядоўнае ўкараненне інтэграванай тэлекамунікацыйнай сістэмы пропуску ў будынак універсітэта.

### *IV.VI. Міжнародная дзейнасць*

Мэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у галіне міжнароднай дзейнасці – умацаванне аўтарытэту ўніверсітэта на міжнароднай арэне і дасягненне статусу міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра.

У сферы міжнароднай дзейнасці запатрабуецца рашэнне наступных задач:

– інтэграцыя ўніверсітэта ў міжнародную акадэмічную прастору;

– развіццё партнёрскіх сувязей з вядучымі замежнымі адукацыйнымі і навуковымі цэнтрамі праз удзел у міжнародных праграмах і праектах, акадэмічныя абмены;

– умацаванне пазіцый на сусветным і нацыянальным рынках адукацыйных паслуг.

Для рашэння пастаўленых задач у наступным пяцігоддзі патрабуецца:

– стварэнне прывабнага для замежных студэнтаў і партнёраў іміджу ўніверсітэта. Сістэматычная інфармацыйна-рэкламная праца па распаўсюджванні за межамі Рэспублікі Беларусь пазітыўных звестак аб універсітэце, у прыватнасці яго навуковым і адукацыйным патэнцыяле;

– актыўны ўдзел у міжнародных навукова-адукацыйных канферэнцыях, выставах і іншых мерапрыемствах з мэтай папулярызацыі дасягненняў і патэнцыялу ўніверсітэта;

– удасканаленне інфармацыйнай падтрымкі міжнароднай дзейнасці, стварэнне англамоўнай версіі інтэрнэт-сайта ўніверсітэта як сродку інтэграцыі ў міжнародную навуковую і адукацыйную прастору;

– усталяванне новых і развіццё існуючых кантактаў з замежнымі вучэбнымі і навукова-даследчымі ўстановамі;

– фарміраванне спрыяльных умоў для далейшага развіцця экспарту адукацыйных паслуг і прыцягненне замежных студэнтаў;

– пераадоленне моўнага бар’ера ў зносінах з замежнымі грамадзянамі, распрацоўка і рэалізацыя мер па ўдасканаленні навучання рускай мове;

– выхаванне замежных грамадзян у духу павагі і трымання беларускіх традыцый і заканадаўства.

### *IV.VII. Кадравае забеспячэнне і кіраўніцкія тэхналогіі*

Адсутнасць эфектыўных кіраўніцкіх тэхналогій, арыентаваных на нацыянальную спецыфіку і асвоеных кіраўнікамі, прыводзіць да зніжэння тэмпаў рэалізацыі запланаваных праграм і праектаў. Для рашэння гэтай праблемы неабходна правесці ўкараненне прынцыпаў сучаснага прафесійнага менеджменту ў навуковай, адукацыйнай, выхаваўчай, творчай дзейнасці на аснове аналізу індывідуальных, сацыяльных і міжнародных аспектаў інавацыйнага развіцця.

У кадравай палітыцы мэтай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з’яўляецца стварэнне школы, арыентаванай на падрыхтоўку беларускай педагагічнай, навуковай, творчай, кіраўніцкай эліты, здольнай адказваць на выклікі эпохі глабалізацыі і інавацыйнага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах стварэння ўмоў для падрыхтоўкі нацыянальнай кіраўніцкай эліты, распрацоўкі і адаптацыі кіраўніцкіх тэхналогій плануецца фарміраванне адукацыйных праграм дадатковай прафесійнай адукацыі, інтэрнацыяналізацыя навукова-педагагічнага калектыву, развіццё інфраструктуры ўніверсітэта, у тым ліку бібліятэкі і інфармацыйных рэсурсаў.

Забеспячэнне дзейнасці па рэалізацыі палажэнняў Праграмы патрабуе мадэрнізацыі сістэмы кіравання ўніверсітэтам, у тым ліку распрацоўкі і ўкаранення рэгламентаў, баз даных, «электроннай адміністрацыі», аптымізацыі арганізацыйнай структуры і штатнага раскладу. Будуць пашыраны праграмныя ўзаемадзеянні з рэспубліканскімі і мясцовымі органамі дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь па выкананні шырокага спектра прыкладных даследаванняў у мэтах садзейнічання ў рашэнні дзяржаўных задач.

У вядучых універсітэтах свету аснову росту складае не толькі канцэнтрацыя вядучых вучоных і прыцягненне маладых кадраў, але і ўніверсальная сістэма доступу да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў. Плануецца стварэнне і забеспячэнне функцыянавання такой сістэмы, якая забяспечвае доступ да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў універсітэта ўсім зацікаўленым карыстальнікам.

Рэалізацыю прызначаных *задач* плануецца здзейсніць шляхам правядзення наступных мерапрыемстваў:

– развіццё сістэмы кіравання, стварэнне навуковых асноў сучасных кіраўніцкіх тэхналогій;

– стварэнне сістэмы падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў;

– стварэнне інфармацыйнай сістэмы для доступу да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў універсітэта;

– стварэнне сістэмы маніторынга кадравага патэнцыялу і прагназаванне патрэбнасці ў навукова-педагагічных, кіраўніцкіх кадрах;

– прыцягненне ў вучэбны працэс навуковых супрацоўнікаў акадэмічных інстытутаў, вядомых вучоных, знаных спецыялістаў-практыкаў як з Беларусі, так і з-за мяжы;

– арганізацыя бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі, развіццё паслявузаўскай адукацыі, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, другой вышэйшай адукацыі;

– удасканаленне моўнай падрыхтоўкі студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў;

– работа з маладымі выкладчыкамі, падтрымка таленавітай студэнцкай моладзі;

– развіццё і ўдасканаленне сістэмы псіхалагічнага суправаджэння работы з персаналам, фарміраванне карпаратыўнай культуры;

– распрацоўка стымулюючых і матывацыйных механізмаў, накіраваных на падвышэнне ў супрацоўнікаў універсітэта зацікаўленасці і задаволенасці працай, яе ацэнкай і ўзроўнем аплаты.

### *IV.VII.I. Забеспячэнне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук)*

Асаблівае значэнне для кадравага забеспячэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мае працэс падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. З улікам заявак кафедраў універсітэта сфарміраваны перспектыўны план патрэбнасці ўніверсітэта ў навуковых кадрах вышэйшай кваліфікацыі да 2015 г. План набору ў аспірантуру на 2011–2015 гг. складае штогод 20 чалавек, у дактарантуру – 1 чалавек.

Для падвышэння эфектыўнасці сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў праз аспірантуру і дактарантуру неабходна ўдасканаленне ўзаемадзеяння з рэгіянальнымі ўпраўленнямі і ўстановамі культуры, адукацыі, іншымі ведамствамі. Развіццё інстытута мэтавага набору для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі дазволіць не толькі ўмацаваць сувязі ўніверсітэта з арганізацыямі культуры на месцах, але і аптымізаваць набор у аспірантуру на карысць кадравых патрэбнасцей універсітэта ў падрыхтоўцы выкладчыцкага саставу. У 2011–2015 гг. для ўніверсітэта плануецца штогадовая падрыхтоўка 6–8 аспірантаў, якія навучаюцца па кантрактах.

Адзін з найважнейшых паказчыкаў падвышэння эфектыўнасці працы аспірантуры – павелічэнне колькасці аспірантаў, якія прадстаўляюць ва ўстаноўлены тэрмін завершаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысертацыйныя даследаванні. У ліку пытанняў, што патрабуюць асаблівай увагі, – усебаковы аналіз абгрунтаванасці выбару тэматыкі дысертацыйных даследаванняў, іх максімальная адпаведнасць прыярытэтным кірункам фундаментальных і асабліва прыкладных даследаванняў. Не менш важнымі ўяўляюцца пытанні падвышэння персанальнай адказнасці навуковых кіраўнікоў і загадчыкаў кафедраў за правядзенне прамежкавай і падагульняючай атэстацыі, а таксама ўдасканаленне сістэмы папярэдняй экспертызы дысертацый у працэсе навучання на апошнім курсе аспірантуры.

### *IV.VII.II. Арганізацыя павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі, стажыровак супрацоўнікаў універсітэта*

Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў і праходжанне стажыровак супрацоўнікаў універсітэта адбываецца ў асноўным на базе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Рэспубліканскага інстытута інавацыйных тэхналогій, Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў фізічнай культуры, спорту і турызму, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у вядучых навучальных установах г. Мінска. Перападрыхтоўка вядзецца ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы на базе вышэйшай адукацыі з атрыманнем дыплома аб перападрыхтоўцы і з прысваеннем кваліфікацыі «Спецыяліст па педагагічным вымярэнні», «Спецыяліст па рабоце з моладдзю», «Спецыяліст па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце», «Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі», «Культуролаг, выкладчык культуралагічных дысцыплін».

У 2011 г. на базе ўніверсітэта будуць арганізаваны курсы «Інавацыйная адукацыя і сістэма кіравання якасцю ў ВНУ» і «Кампетэнтнасныя мадэлі падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ: тэорыя і практыка праектавання». Спецыяльна распрацаваныя праграмы дадуць магчымасць атрымаць неабходныя веды і задаволіць прафесійна-адукацыйныя патрэбнасці супрацоўнікаў і выкладчыкаў, абнавіць і падвысіць прафесійную кампетэнцыю.

Неабходна завяршэнне фарміравання базы даных для праходжання стажыровак і павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у краінах блізкага і далёкага замежжа на 2011–2015 гг.

### *IV.VIII. Матэрыяльна-тэхнічная база і інфраструктура ўніверсітэта*

Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы і інфраструктуры ўніверсітэта ў адпаведнасці з сучаснымі тэхналагічнымі патрабаваннямі з’яўляецца адной з асноўных умоў падвышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, узроўню навуковых даследаванняў, мастацка-творчай дзейнасці, эфектыўнасці кіраўніцкіх рашэнняў.

У ходзе рэалізацыі палажэнняў Праграмы неабходна сканцэнтраваць намаганні на рашэнні наступных асноўных *задач*:

– правядзенне своечасовых работ па рамонце ўніверсітэцкага комплексу будынкаў і капітальным будаўніцтве новых аб’ектаў;

– прыярытэтнае матэрыяльна-тэхнічнае і гаспадарчае забеспячэнне дзейнасці вучэбных, навуковых, выхаваўчых структурных падраздзяленняў;

– забеспячэнне сацыяльна-бытавых умоў у студэнцкіх інтэрнатах;

– стварэнне бяспечных умоў працы;

– энергаэфектыўнасць і эканомія паліва-энергетычных рэсурсаў.

Рэалізацыю дадзеных задач плануецца здзейсніць шляхам правядзення наступных мерапрыемстваў:

– забяспечыць своечасовую распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па аб’ектах універсітэта, запланаваных для правядзення капітальнага рамонту і мадэрнізацыі;

– забяспечыць увод у эксплуатацыю спартыўна-культурнага цэнтра;

– правесці комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на ўкараненне энергаэфектыўнага абсталявання будынкаў, забяспечыўшы да 2015 г. эканамічны эфект – эканомію 66 тон умоўнага паліва ў год;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– зрабіць замену ўстарэлай мэблі і абсталявання ў студэнцкіх інтэрнатах, вучэбных аўдыторыях, месцах агульнага карыстання;

– зрабіць аснашчэнне дэканатаў, кафедральных памяшканняў, адміністрацыйных падраздзяленняў сучаснай камп’ютарнай і аргтэхнікай, мэбляй і абсталяваннем;

– арганізаваць закупку камп’ютарнай тэхнікі для павелічэння колькасці камп’ютарных лабараторый, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе, удвая к 2015 г.;

– абсталяваць сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання паточныя лекцыйныя аўдыторыі ўніверсітэта;

– распрацаваць і рэалізаваць стандарты тэхнічнай аснашчанасці кафедраў спецыялізаванай тэхнікай, сцэнічнымі касцюмамі, музычнымі інструментамі для паўнацэннай арганізацыі вучэбнага працэсу па замацаваных спецыяльнасцях і напрамках.

## V. ФІНАНСАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАГРАМЫ

Фінансаванне мерапрыемстваў Праграмы прадугледжваецца здзяйсняць за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, выдзяляемых на ўтрыманне ўніверсітэта. Таксама плануецца прыцягненне:

– сродкаў ад прыносячай даход пазабюджэтнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;

– сродкаў, выдзяляемых Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях, Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных навуковых даследаванняў; спецыяльных грантаў у рамках зацверджаных навуковых праграм, заданняў і інавацыйных праектаў;

– сродкаў беларускіх і міжнародных арганізацый, фондаў і аб’яднанняў;

– спонсарскіх паступленняў.

Дзяржаўная падтрымка Праграмы ажыццяўляецца па параграфу «Вышэйшая адукацыя» раздзела «Адукацыя» класіфікацыі расходаў бюджэту. У 2011–2015 гг. за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту выдзяляецца 6,145 млрд руб. на мерапрыемствы па развіцці адукацыйнай і інфармацыйнай інфраструктуры і 43,41 млрд руб. на мерапрыемствы па капітальным рамонце коплексу будынкаў універсітэта.

## VI. ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМЫ к 2015 г.

Рэалізацыя прыярытэтных напрамкаў Праграмы забяспечыць канкурэнтаздольнасць адукацыйных праграм і навуковых даследаванняў на міжнародных рынках, арганізацыйную ўстойлівасць і міжнароднае прызнанне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У 2012 г. завершыцца пераход на адукацыйныя стандарты 2-га пакалення. На аснове аналізу айчыннага і сусветнага вопыту падвышэння якасці за кошт патрабаванняў да структуры, зместу, практычнай накіраванасці, матэрыяльна-тэхнічнага, вучэбна-метадычнага і інфармацыйнага забеспячэння адукацыйных праграм плануецца перайсці на новы якасны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў.

Паралельна будуць праведзены мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў. Нароўні з выкарыстаннем механізмаў конкурснага адбору на пасады прафесарска-выкладчыцкага саставу мерапрыемствы Праграмы дазваляюць, захаваўшы ядро выкладчыцкага калектыву, істотна падвысіць эфектыўнасць іх працы і дасягнуць к 2015 г. новай якасці выкладчыцкага корпусу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Мяркуецца істотна пашырыць практыку і тэхналогіі распаўсюджвання пазітыўнага вопыту адукацыйнай дзейнасці ўніверсітэта ў сістэме вышэйшай адукацыі. Узрасце колькасць слухачоў праграм дадатковай адукацыі, у тым ліку аб’ём павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў іншых ВНУ.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў зойме лідзіруючыя пазіцыі ў інтэрнацыянальнай адукацыйнай дзейнасці. Гэта падвысіць канкурэнтаздольнасць універсітэта, дазволіць істотна пашырыць экспарт адукацыйных паслуг і павялічыць колькасць навучэнцаў – замежных студэнтаў на 80% к 2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў увойдзе ў лік прызнаных у айчынным і міжнародным акадэмічным асяроддзі лідараў фундаментальных навуковых даследаванняў, а таксама пашырыць спектр прыкладных даследаванняў, у тым ліку для стварэння камерцыйных прадуктаў на аснове вынікаў даследчых работ.

Павялічыцца доля навукова-педагагічных работнікаў, якія вядуць навуковую работу ў рамках фінансавання за кошт беларускіх і міжнародных навуковых фондаў. Падвысіцца эфектыўнасць удзелу навукова-педагагічных работнікаў універсітэта ў рэалізацыі галіновых, рэспубліканскіх і міжнародных праграм і праектаў.

Узровень навуковых даследаванняў, матэрыяльна-тэхнічнага, інфраструктурнага і кадравага забеспячэння ўмоў навуковай работы зробіць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў прывабным для замежных даследчыкаў. Узрастуць паказчыкі акадэмічнай мабільнасці вучоных універсітэта і колькасць сумесных праектаў з даследчымі калектывамі замежных навукова-адукацыйных цэнтраў.

Высокая эфектыўнасць фундаментальных і прыкладных даследаванняў падвысіць прывабнасць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў для заказчыка прыкладных даследаванняў, пашырыць кола яго партнёраў і забяспечыць рост аб’ёмаў фінансавання навуковых даследаванняў, што дазволіць забяспечыць к 2015 г. долю даходаў ад рэалізацыі аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці да 5% ад агульнага аб’ёму пазабюджэтных паступленняў.

Універсітэт зойме лідзіруючыя пазіцыі ў галіне экспертнай дзейнасці. На аснове існуючага вопыту будзе сфарміраваная практыка аказання платных экспертных паслуг. Дзеля гэтага к 2012 г. будзе завершана праца па фарміраванні ўніверсітэцкага корпусу экспертаў шырокага спектра напрамкаў, распрацавана і рэалізавана тэхналогія прыцягнення заказаў на экспертныя паслугі ад органаў улады, дзяржаўных арганізацый, прыватных структур.

Выхад адукацыйнай, навукова-даследчай, інавацыйнай, мастацка-творчай дзейнасці на якасна новы ўзровень дазволіць Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў як лідару сістэмы вышэйшай адукацыі ў сацыякультурнай сферы засяродзіць намаганні на рашэнні наступных ключавых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь:

– развіццё чалавечага патэнцыялу, задавальненне эстэтычных патрэбнасцей асобы, рэалізацыя здольнасцей і талентаў праз навукова абгрунтаваную практыку стварэння і рэалізацыі актуальных адукацыйных праграм;

– развіццё кадравых рэсурсаў для інтэграванай з вышэйшай адукацыяй сістэмы навуковых даследаванняў і распрацовак, стымулюючых інавацыйнае развіццё;

– фарміраванне сацыяльна адказнай, інтэлектуальнай эліты, спрыяючай устойліваму функцыянаванню дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў;

– кадравае, навуковае, экспертнае забеспячэнне функцыянавання і развіцця сацыякультурнай сферы на аснове інавацыйнага развіцця навукова-тэхналагічнага патэнцыялу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ на 2011–2015 гг.

Праграму распрацавалі:
Ю.П.Бондар (главы І, ІІ, ІІІ, V, VІ; параграфы IV.III, IV.VII)
К.І.Рэмішэўскі (параграфы IV.II, IV.IV)
В.В.Макравусаў (параграф IV.VIII)
Р.А.Ровіна, С.Л.Шпарло (параграф IV.I)
Т.В.Альхімовіч (параграф IV.VI)
В.В.Казлоўскі (параграф IV.V)

Агульная рэдакцыя – Ю.П.Бондар

*Праграма адобрана на пасяджэнні Савета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 5 ад 18.01.2011 г.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## І. ПЕРАДУМОВЫ РАЗВІЦЦЯ

У сучасных умовах глабалізацыі і інтэграцыі сусветнай супольнасці і з улікам перспектыў эканамічнага і сацыяльнага развіцця Рэспублікі Беларусь Праграма развіцця ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» на 2011–2015 гг. (далей – Праграма) як унікальнага навукова-адукацыйнага, мастацка-творчага комплексу накіравана на падтрыманне канкурэнтаздольнасці Рэспублікі Беларусь у глабальным спаборніцтве інавацыйных супольнасцей і эканомік, заснаваных на ведах.

Праграма грунтуецца на палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, зацверджанай на IV Усебеларускім народным сходзе 8 снежня 2010 г., Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)», патрабаваннях нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь, пазітыўным вопыце вядучых універсітэтаў свету і ўлічвае ўнікальныя асаблівасці і творчы патэнцыял БДУКМ як вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сферы культуры і мастацтваў у нацыянальнай сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Праграма грунтуецца на каштоўнасцях, якія склаліся і прымнажаюцца ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» – нацыянальным шматпрофільным, гуманітарным навукова-адукацыйным, сацыяльна-культурным і мастацка-творчым цэнтры Рэспублікі Беларусь. Калектыў універсітэта забяспечвае падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для ўстаноў і арганізацый сацыяльна-культурнай сферы і мастацтва, захоўвае і прымнажае класічныя традыцыі нацыянальнай культурнай спадчыны і ўніверсітэцкай адукацыі, распаўсюджвае і сцвярджае гуманістычныя ідэалы сусветнай культуры.

Праграма накіравана на забеспячэнне лідэрства ўніверсітэта ў адукацыйнай, выхаваўчай, навуковай і творчай сферах. Паказчыкі, дасягнутыя Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, могуць стаць арыенцірамі, якія вызначаюць напрамкі і ўзроўні развіцця як асобных беларускіх ВНУ, так і ўсёй сістэмы мастацкай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ІІ. ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Сучасны стан Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў характарызуюць фундаментальнасць навуковых даследаванняў, заснаваных на традыцыях навуковых школ, якасць і бесперапыннасць розных узроўняў падрыхтоўкі,

міждысцыплінарнасць падыходаў у адукацыі і навуцы, удзел выкладчыкаў і студэнтаў у міжнародных праектах, шматграннасць творчай дзейнасці і высокія мастацкія дасягненні творча-педагагічных школ, эфектыўнасць выхаваўчай работы са студэнцкай моладдзю.

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў дасягаецца дзякуючы высокаму навукова-педагагічнаму статусу прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта. Ва ўніверсітэце працуе больш за 340 штатных выкладчыкаў і больш за 120 сумяшчальнікаў. Сярод выкладчыкаў, якія працуюць на пастаяннай аснове, уключаючы ўнутраных сумяшчальнікаў, больш за палову маюць вучоныя ступені, ганаровыя і вучоныя званні, з іх: 1 акадэмік, 31 доктар і прафесар, больш за 220 дацэнтаў і кандыдатаў навук; 11 выкладчыкаў – ганаровыя званні заслужаны артыст, народны артыст, заслужаны дзеяч культуры, заслужаны дзеяч адукацыі.

Падрыхтоўка спецыялістаў ва ўніверсітэце вядзецца па дзённай і завочнай формах навучання. Па стане на 01.12.2010 г. ва ўніверсітэце навучаюцца 5952 студэнты, у тым ліку 74 на II ступені вышэйшай адукацыі. З іх на дзённай форме навучання – 2923, на завочнай – 2955 чалавек.

Структура ВНУ і сістэма ўзаемадзеяння структурных падраздзяленняў фарміруецца ў адпаведнасці са Статутам універсітэта і ўключае 6 факультэтаў (культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці; музычнага мастацтва; традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва; інфармацыйна-дакументных камунікацый; завочнага навучання; павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў), 25 кафедраў, з якіх 21 з’яўляецца выпускаючай, бібліятэку, а таксама шэраг падраздзяленняў структуры кіравання, дапаможныя службы і інш. У структуру ўніверсітэта як цэласнага навукова-адукацыйнага комплексу ўваходзіць філіял у г. Мазыры.

Структура падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва адпавядае сучасным патрабаванням, якія прад’яўляюцца да ВНУ ўніверсітэцкага тыпу, і ўключае наступныя ступені: вышэйшую адукацыю I ступені, вышэйшую адукацыю II ступені (магістратура), аспірантуру, дактарантуру, перападрыхтоўку кадраў з вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Падрыхтоўка спецыялістаў на I ступені вышэйшай адукацыі ва ўніверсітэце вядзецца па 16 спецыяльнасцях: «Сацыяльная педагогіка», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)»; «Дырыжыраванне (па напрамках)»; «Духавыя інструменты (па напрамках)»; «Спевы (па напрамках)»; «Рэжысура (па напрамках)»; «Мастацтва эстрады (па напрамках)»; «Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)»; «Народная творчасць (па напрамках)»; «Мастацтвазнаўства (па напрамках)»; «Культуралогія (па напрамках)»; «Літаратурная работа (па напрамках)»; «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)»; «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)»; «Сацыяльна-культурная дзейнасць»; «Сацыяльная праца».

Навучанне ў магістратуры – па 5 спецыяльнасцях: «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці», «Культуралогія», «Мастацтвазнаўства», «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», «Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў».

Пры ажыццяўленні набору прыярытэт аддаецца перспектыўным спецыяльнасцям: бібліятэказнаўству і бібліяграфіі, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, мастацтву эстрады, рэжысуры свят, харэаграфічнаму мастацтву. Характэрнай асаблівасцю прыёму ва ўніверсітэт з’яўляецца тое, што ў аснову адукацыі пакладзены прынцып бесперапыннасці. На ўступных экзаменах перавага аддаецца моладзі, якая ўжо мае сярэднюю спецыяльную адукацыю па профілі спецыяльнасці. Так, па спецыяльнасцях музычнага, харэаграфічнага, мастацкага профіляў на першы курс прымаюцца юнакі і дзяўчаты пасля заканчэння музычных, мастацкіх, харэаграфічных вучылішчаў і каледжаў.

З 1975 г. універсітэтам падрыхтавана больш за 20 тыс. высокакваліфікаваных спецыялістаў для сферы культуры, мастацтва і адукацыі. Адметнай асаблівасцю выпускнікоў універсітэта з’яўляецца тое, што яны валодаюць не толькі сістэмай фундаментальных тэарэтыка-метадалагічных ведаў, але і сістэмай уменняў і навыкаў прыкладнога характару. Гэта дазваляе забяспечыць установы культуры гарадоў, раённых цэнтраў, вёсак кадрамі вышэйшай кваліфікацыі. Практычна ва ўсіх раённых і гарадскіх дамах і палацах культуры працуюць выпускнікі ўніверсітэта. Яны ўзначальваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійныя і аматарскія мастацкія калектывы, з'яўляюцца выкладчыкамі музыкі, тэатральных, харэаграфічных і мастацкіх дысцыплін.

Арганізацыя навучальнага працэсу ажыццяўляецца на аснове адукацыйных стандартаў, адзіных для дзённай формы навучання і навучання без адрыву ад вытворчасці, тыпавых і вучэбных планаў спецыяльнасцей, зацверджаных і зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку. Адукацыйныя стандарты вызначаюць агульныя патрабаванні да ўзроўню вышэйшай адукацыі, тэрмінаў навучання, максімальны аб'ём вучэбнай нагрузкі, крытэрыі ацэнкі якасці адукацыі. Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь другога пакалення па спецыяльнасцях распрацаваны ва ўніверсітэце ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і зацверджаны загадамі Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2008 г.

Падрыхтоўка спецыялістаў на першай ступені вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца на 1–3-х курсах у адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі другога пакалення, на 4–5-х курсах – першага пакалення. На кафедрах вядзецца пастаянная работа па ўдасканаленні вучэбна-метадычнага забеспячэння. На базе зацверджаных тыпавых і вучэбных праграм ствараюцца падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы новага пакалення.

Улічваючы спецыфіку і задачы падрыхтоўкі спецыялістаў адпаведнага профілю, надаецца значная ўвага пытанням камп'ютарнага абсталявання навучальнага працэсу. Камп'ютарны парк універсітэта пастаянна абнаўляецца і налічвае больш за 300 адзінак. Непасрэдна для навучальных заняткаў задзейнічана 11 камп'ютарных класаў на 87 працоўных месцаў на базе камп'ютараў 2007–2009 гг. выпуску, для самастойнай работы студэнтаў абсталяваны інфармацыйны цэнтр на 28 працоўных месцаў. У 2008 г. адкрыта электронная бібліятэка на 14 працоўных месцаў і 10 камп'ютарызаваных працоўных месцаў у чытальнай зале. Такім чынам, студэнтамі ў навучальным працэсе і для самападрыхтоўкі выкарыстоўваюцца 139 адзінак камп'ютарнай тэхнікі.

Стратэгічнай лініяй павышэння якасці адукацыі ва ўніверсітэце з'яўляецца арыентацыя на ўдасканаленне самастойнай працы студэнтаў за кошт адпаведнага арганізацыйнага, навукова-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

З улікам спецыфікі падрыхтоўкі кадраў асаблівая ўвага надаецца стварэнню вучэбна-творчых майстэрняў і студэнцкіх творчых калектываў. Сумесная творчасць выкладчыкаў і студэнтаў у такіх умовах дазваляе ў пэўнай ступені забяспечыць прафесійную падрыхтоўку будучых артыстаў, мастакоў, харэографаў, арганізатараў мастацкай творчасці.

Размеркаванне выпускнікоў праводзіцца ў адпаведнасці з Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў, якія навучаюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў ва ўстановах адукацыі, забяспечваючых атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.10. 2002 г. № 1423.

Запатрабаванасць выпускнікоў за апошнія пяць гадоў застаецца нязменна высокай – на аднаго маладога спецыяліста, які падлягае размеркаванню, прыходзіцца па два запыты ад патэнцыяльных работадаўцаў.

Адной з характарыстык міжнародных пазіцый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з'яўляецца цікавасць да навучання з боку замежных грамадзян. Пра гэта сведчыць станоўчая дынаміка колькасці іншаземцаў, што навучаюцца ва ўніверсітэце. Так, у 2007/08 г. ва ўніверсітэце навучалася 116 грамадзян з 11 краін далёкага і блізкага замежжа, у 2008/09 г. – 131 чалавек. У бягучым навучальным годзе ва ўніверсітэце навучаюцца 254 замежныя грамадзяніны з 19 краін. Удвая вырасла колькасць краін, якія даслалі сваіх студэнтаў: КНР, Турцыя, Сірыя, Іран, Індыя, Камерун, Польшча, Літва, Латвія, Азербайджан, Малдова, Туркменістан, Арменія, Грузія, Украіна, Расійская Федэрацыя.

Ва ўніверсітэце прызнаныя 4 навукова-педагагічныя школы: у галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» (доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў); у галіне педагогікі «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» (доктар педагагічных навук, прафесар Я.Д.Грыгаровіч); у галіне мастацтвазнаўства «Кампаратыўнае мастацтвазнаўства» (доктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства, прафесар В.П.Пракапцова); у галіне культуралогіі «Сусветная і айчынная культура» (доктар філасофскіх навук, прафесар М.А.Мажэйка; доктар культуралогіі, прафесар А.І.Смолік).

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі ажыццяўляецца праз аспірантуру з 1989 г. і дактарантуру з 1998 г. У цяперашні час ва ўніверсітэце праходзяць навучанне 3 дактаранты, 69 аспірантаў (49 – вочна, 20 – завочна), 14 замежных аспірантаў (КНР, Камерун). Навуковае кіраўніцтва і навуковае кансультаванне аспірантаў і дактарантаў ажыццяўляюць 17 дактароў навук, прафесараў і 36 кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Сёння ва ўніверсітэце працуюць 2 дысертацыйныя саветы:

– савет па абароне дысертацый Д 09.03.01. У кампетэнцыю савета ўваходзіць абарона дысертацый на суісканне вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук па спецыяльнасцях 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва (мастацтвазнаўства) і 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры (культуралогія);

– савет па абароне дысертацый К 09.03.01, якому дазволена праводзіць абароны дысертацый па спецыяльнасцях 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (педагагічныя навукі) і 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці (педагагічныя навукі).

Агульная колькасць абарон за апошняе пяцігоддзе пададзена ў табліцы:

| Абаронена дысертацый | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|
| Доктарскіх | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 |
| Кандыдацкіх | 9 | 3 | 6 | 8 | 11 |
| Усяго… | 10 | 4 | 7 | 9 | 11 |

Працэнт абарон кандыдацкіх дысертацый выпускнікамі аспірантуры на працягу 3 гадоў пасля яе заканчэння складае за гэтыя гады – 26,8% (11 чалавек).

У перыяд з 2006 г. суіскальнікамі дактарантуры абаронены 4 доктарскія дысертацыі: 2 – у дысертацыйным савеце ўніверсітэта, 1 – у Інстытуце мастацтвазнаўства г. Масквы, 1 – у Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце (факультэт паліталогіі і філасофіі).

Ва ўніверсітэце функцыянуюць праблемныя саветы па профільных спецыяльнасцях: мастацтвазнаўстве, культуралогіі, педагагічных навуках, гістарычных навуках, філасофскіх навуках, філалагічных навуках. Праблемныя саветы аб’ядноўваюць кафедры на аснове агульнасці вырашаемых імі навуковых задач і блізкасці тэматыкі з мэтай засяроджвання намаганняў на комплексных навуковых напрамках дзейнасці ўніверсітэта, ажыццяўляюць навукова-метадычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва навукова-даследчай дзейнасцю студэнтаў, аспірантаў, дактарантаў і суіскальнікаў.

У 2010 г. завяршыўся перыяд выканання заданняў галіновай навукова-тэхнічнай праграмы «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.». З 2008 г. функцыі галаўной арганізацыі па вышэйназванай праграме былі замацаваны за Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Даследаванні, рэалізаваныя ў рамках праграмы, забяспечылі магчымасць аптымізацыі кіравання навукова-даследчымі працамі ў сферы культуры і мастацтва, стварылі спрыяльныя ўмовы для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, развіцця навуковых школ, рэалізацыі інтэлектуальнага патэнцыялу маладых вучоных.

Навукова-даследчая работа ажыццяўляецца на 24 кафедрах і ў 2 лабараторыях – навукова-творчай лабараторыі традыцыйных рамёстваў беларусаў і навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў. За 2006–2010 гг. праведзены прыкладныя і фундаментальныя даследаванні па 27 тэмах, зарэгістраваных у Беларускім інстытуце сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы.

Аб’ём фінансавання навуковых даследаванняў з дзяржбюджэту за 2007–2010 гг. склаў 961,2 млн руб.

Вынікі даследаванняў, праведзеных у 2010 г., адлюстраваны ў навуковых публікацыях, сярод іх: 11 манаграфій, 8 зборнікаў навуковых прац, 22 падручнікі і навучальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікі (5 – з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), 14 вучэбна-метадычных выданняў, 13 дэпаніраваных навуковых прац, 390 артыкулаў у навуковых часопісах і зборніках (59 – у рэцэнзуемых выданнях ВАК і 82 – у замежных навуковых выданнях), 279 тэзісаў навуковых канферэнцый і 18 электронных выданняў. Агульны аб'ём публікацый прафесарска-выкладчыцкага саставу ўніверсітэта ў 2010 г. склаў больш за 960 друкаваных аркушаў.

Цэнтрам інфармацыйна-бібліятэчнага забеспячэння даследчай і адукацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з'яўляецца бібліятэка. У фондах бібліятэкі сабраныя каля 550 тыс. кніг і рукапісаў, карыстальнікам прадастаўляецца доступ больш чым да 100 тыс. электронных крыніц, уключаючы навуковыя часопісы, манаграфіі, дысертацыі і даведачныя выданні.

Дзейнасць універсітэцкіх студэнцкіх аркестраў, харавых, тэатральна-драматычных, харэаграфічных, вакальных і інструментальных студэнцкіх калектываў вядомая далёка за межамі Беларусі. Ва ўніверсітэце актыўна развіваюцца больш за 50 вучэбных творчых калектываў, якія забяспечваюць падрыхтоўку кіраўнікоў і артыстаў музычных, харэаграфічных, тэатральных калектываў, студый народна-прыкладнога мастацтва, арганізатараў аматарскай творчасці, мастацкай самадзейнасці і святочна-абрадавай дзейнасці.

За апошнія два гады каля 140 студэнтаў універсітэта сталі лаўрэатамі і дыпламантамі прэстыжных мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. За ўвесь перыяд існавання спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (з 1996 г.) студэнтамі і калектывамі БДУКМ было атрымана 101 заахвочванне. Сярод іх: гранд-прэмій з прысваеннем звання лаўрэата фонду – 10, стыпендый з прысваеннем стыпендыята фонду – 68, прэмій з прысваеннем звання дыпламанта фонду – 3, заахвочвальных прэмій – 20.

Па стане на 01.12.2010 г. у Адзіным рэспубліканскім электронным банку даных таленавітай моладзі знаходзяцца 49 прадстаўнікоў з ліку студэнтаў і выпускнікоў БДУКМ і 9 калектываў.

Сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце мае шматступеньчатую структуру, якая ўключае: рэктарат, дэканаты, кафедры, аддзел выхаваўчай работы з моладдзю, студэнцкі савет, ПА ГА «БРСМ», ПА РГА «Белая Русь», студэнцкі прафсаюз. З мэтай вывучэння, ацэнкі і перспектыўнага планавання выхаваўчай работы штогод праводзіцца маніторынг на розных узроўнях: кафедральным, факультэцкім, універсітэцкім.

Членамі ПА ГА «БРСМ» у 2009/10 г. лічацца 36,7%, студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі – 96,5%, пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» – 9% ад агульнай колькасці студэнтаў універсітэта.

Інтэнсіўна развіваецца студэнцкае самакіраванне, дзейнічаюць 7 студэнцкіх саветаў – універсітэта, 4 факультэтаў, 2 студэнцкіх інтэрнатаў. Усяго актыў студэнцкіх саветаў у 2009/10 г. склаў 9% ад агульнай колькасці студэнтаў.

У 2009/10 г. ва ўніверсітэце праведзена 545 мерапрыемстваў інфармацыйна-ідэалагічнай накіраванасці, 97 спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў і спаборніцтваў (68,1% ад агульнай колькасці студэнтаў). Пад кіраўніцтвам спартыўнага клуба студэнты ўдзельнічалі ў Зорных і турыстычных паходах, спартыўных акцыях – усяго ў 2009/10 навучальным годзе ажыццёўлена 48 мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел больш за 40% студэнтаў.

Забяспечанасць інтэрнатам у 2009/10 г. склала 89,7%.

У студэнцкіх інтэрнатах працуюць 23 клубныя фарміраванні, якія аб'ядноўваюць 13,2% студэнтаў.

Студэнты ўніверсітэта ў 2009/10 г. прынялі ўдзел у 1165 культурна-масавых мерапрыемствах на ўзроўні ўніверсітэта, горада, рэспублікі і на міжнародным узроўні.

У 2010 г. ва ўніверсітэце створаны комплекс, які ўключае: музей гісторыі ўніверсітэта, музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музей беларускіх народных інструментаў, музей рэдкай кнігі, галерэю славы «Культура як мазаіка імён». Выхаваўчы патэнцыял музейнага комплексу рэалізуецца ў рабоце з моладдзю – на яго базе праводзяцца мерапрыемствы па азнаямленні студэнтаў з гісторыяй універсітэта, куратарскія гадзіны, практычныя заняткі, сустрэчы з народнымі майстрамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важная роля ў сістэме ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце адводзіцца выкладанню блока сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Выкладчыкамі праводзіцца актыўная работа па распрацоўцы і ўкараненні індывідуальных вучэбна-метадычных комплексаў як сістэмнага, універсальнага механізма рэалізацыі інавацыйных тэхналогій адукацыі і выхавання спецыялістаў. Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўніверсітэта зацверджаны крытэрыі якасці вучэбна-метадычнага комплексу, у адпаведнасці з якімі падрыхтаваны і выдадзены ВМК з грыфам Міністэрства адукацыі: у 2008 г. – «Паліталогія: навука аб палітыцы», у 2009 г. – «Асновы ідэалогіі Беларускай дзяржавы», у 2010 г. – «Культуралогія» і інш. (больш за 21 падручнік і вучэбны дапаможнік).

Наладжана сістэма ўзаемадзеяння з органамі ўнутраных спраў, дзейнічае студэнцкая добраахвотная дружына. Ажыццяўляецца аналіз узроўню правапарушэнняў сярод студэнтаў, а таксама прычын супрацьпраўных паводзін (за 2006 г. зарэгістраваны 4 правапарушэнні, за 2007–2010 гг. правапарушэнні не адзначаны).

Важным напрамкам сацыяльна-культурнай дзейнасці ўніверсітэта з'яўляецца арганізацыя і правядзенне фестываляў і конкурсаў міжнароднага і рэспубліканскага значэння. У 2008 г. у Мінску праводзіліся V маладзёжныя Дэльфійскія гульні, у якіх прынялі ўдзел каманды з 11 краін у 17 намінацыях. Для забеспячэння гульняў быў арганізаваны штаб з супрацоўнікаў універсітэта, наладжана работа студэнцкіх валанцёрскіх атрадаў. Якасць арганізацыі і правядзення V маладзёжных Дэльфійскіх гульняў атрымала высокую ацэнку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, актыўныя члены штаба адзначаны граматамі і падзякамі.

З 13 па 17 мая 2010 г. у Мінску праходзіў Фестываль культур народаў ЕўрАзЭС. У фестывалі прынялі ўдзел дэлегацыі Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь. Аргкамітэт фестывалю, які складаўся з супрацоўнікаў універсітэта, забяспечыў правядзенне праграмы мерапрыемстваў як у Мінску, так і ў абласцях рэспублікі. Сакратарыятам Інтэграцыйнага камітэта ЕўрАзЭС і Міністэрствам культуры ўзровень падрыхтоўкі і арганізацыі Фестывалю культур народаў ЕўрАзЭС быў прызнаны высокім і адзначаны граматамі і падзякамі.

Універсітэт таксама прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў «Зорка ўзышла над Беларуссю».

Адным з вырашальных фактараў развіцця ўніверсітэта з'яўляецца ступень фінансавага забеспячэння. Бюджэтныя асігнаванні скарачаюцца, у гэтых умовах універсітэт прыцягвае дадатковыя крыніцы фінансавання, самым стабільным з якіх з'яўляецца падрыхтоўка студэнтаў на платнай аснове. За перыяд з 2007 па 2009 г. даходы ад пазабюджэтнай дзейнасці ўзраслі на 208,3% і склалі 8 773,3 млн руб., у тым ліку ад паслуг адукацыі 6434,5 млн руб., або 73,3% ад агульнага аб'ёму.

Пазабюджэтныя даходы з'яўляюцца асноўнай крыніцай абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы і павышэння даходаў працоўнага калектыву. Так, напрыклад, на набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў за перыяд 2007–2009 гг. са сродкаў рэспубліканскага бюджэту выдзелена 300,6 млн руб., з пазабюджэтных сродкаў універсітэта – 2006,1 млн руб., што складае 86,7% ад агульнай сумы фінансавання.

На працягу 2007–2009 гг. сродкі, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці, накіроўваліся на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта, павышэнне заработнай платы супрацоўнікаў. Каэфіцыент абнаўлення вучэбна-матэрыяльнай і навукова-даследчай базы ў 2007 г. склаў 14,9%, у 2008 г. – 40,2%, у 2009 г. – 14,5%.

На абнаўленне вучэбна-матэрыяльнай і навукова-даследчай базы ўніверсітэта ў 2008 г. была накіравана асноўная доля даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці. Нездавальняючы стан вучэбных аўдыторый патрабаваў правядзення бягучага рамонту, і ў 2009 г. на гэтыя мэты накіравана 2764,6 млн руб., што дазволіла значна палепшыць умовы для навучання. Пазабюджэтныя выдаткі на аплату камунальных паслуг у 2009 г. склалі 330,3 млн руб., або 151,9% да ўзроўню 2007 г.

Сярэднямесячная заработная плата ў 2009 г. склала 1016,7 млн руб. і ўзрасла ў параўнанні з 2007 г. на 28,9%. Выдаткі на заработную плату супрацоўнікаў універсітэта за кошт пазабюджэтных сродкаў у 2009 г. склалі 1797,9 млн руб., або 152,4% да ўзроўню 2007 г. Акрамя таго, у 2009 г. на павышэнне заработнай платы накіравана са сродкаў фонду матэрыяльнага заахвочвання 912,7 руб., або 110,9% у параўнанні з 2007 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, аналіз дынамікі асноўных паказчыкаў, якія характарызуюць дзейнасць універсітэта, сведчыць аб яго стабільным устойлівым развіцці.

## ІІІ. СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА ПРАГРАМЫ

Місія ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» – падрыхтоўка высакакласных спецыялістаў, выхаванне інтэлектуальнай і мастацкай эліты грамадства на аснове інтэграцыі ў міжнародную адукацыйную прастору праз распаўсюджанне і замацаванне гуманістычных ідэалаў сусветнай культуры, захаванне і прымнажэнне традыцый нацыянальнай культурнай спадчыны. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», захоўваючы пазіцыі вядучай ВНУ рэспублікі ў галіне культуры і мастацтва, імкнецца атрымаць міжнароднае прызнанне і стаць інавацыйнай установай адукацыі, дзе спалучаюцца лепшыя акадэмічныя традыцыі і новыя ідэі, што забяспечваюць высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных да самарэалізацыі, гатовых да паспяховай прафесійнай дзейнасці ў сацыякультурнай сферы.

**Стратэгічнай мэтай Праграмы** з'яўляецца ўваходжанне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у сусветную эліту профільных універсітэтаў і комплекснае даследчае і адукацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь, што прадвызначае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў як:

– навукова-адукацыйны комплекс, які забяспечвае эфектыўную інтэграцыю навукова-даследчай, мастацка-творчай дзейнасці і праграм падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з высокім узроўнем гатоўнасці да самастойнай практычнай прафесійнай дзейнасці;

– установу вышэйшай адукацыі, прызнаную ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой, пацвярджаемую міжнароднымі рэйтынгамі;

– інтэлектуальны цэнтр, што распаўсюджвае свой пазітыўны вопыт у адукацыйнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, мастацка-творчай і выхаваўчай дзейнасці;

– аналітычны цэнтр, які выконвае дзяржаўныя заказы ў галіне інавацыйнага развіцця, навуковага, экспертнага забеспячэння сферы культуры.

## IV. ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ НАПРАМКІ І ЗАДАЧЫ ПРАГРАМЫ

З улікам прыярытэтаў, вызначаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, зацверджанай на IV Усебеларускім народным сходзе 8 снежня 2010 г., дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)», наяўнага інтэлектуальнага, кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага патэнцыялу, партнёрскіх сувязей у Беларусі і за мяжой, сучасных тэндэнцый у развіцці сусветнай навукі і ўніверсітэцкай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вылучаюцца наступныя прыярытэтныя кірункі сістэмнага развіцця:

– *адукацыйная дзейнасць;*
– *навуковая і інавацыйная дзейнасць;*
– *ідэалагічная і выхаваўчая работа з моладдзю;*
– *дзейнасць творчых калектываў;*
– *інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі;*
– *міжнародная дзейнасць;*
– *кадравае забеспячэнне і кіраўніцкія тэхналогіі;*
– *матэрыяльна-тэхнічная база і інфраструктура ўніверсітэта.*

Задачы Праграмы вызначаюць механізмы рэалізацыі прыярытэтных кірункаў праз сістэмнае развіццё ключавых рэсурсаў універсітэта, у тым ліку адукацыйных праграм, навуковых даследаванняў, інавацыйнай дзейнасці, а таксама інфраструктурнага комплексу і сістэм кіравання.

Развіццё кожнага прыярытэтнага кірунку павінна садзейнічаць мадэрнізацыі сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў і ўзнаўленню навуковых кадраў новага пакалення, вызначэнню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перспектыўных вектараў навуковых даследаванняў, захаванню, папулярызацыі і прымнажэнню духоўных багаццяў беларускага народа.

Развіццё прыярытэтных кірункаў прадугледжвае завяршэнне фарміравання сістэмы ўніверсітэцкай вучэбна-праграмнай дакументацыі, стандартаў і патрабаванняў, якія забяспечваюць нормы якасці падрыхтоўкі выпускнікоў і гарантуюць высокую прафесійную кваліфікацыю ўладальнікаў універсітэцкага дыплома, рост колькасці выпускнікоў вышэйшай кваліфікацыі, а таксама значнае развіццё акадэмічнай мабільнасці навучэнцаў і навукова-педагагічных работнікаў.

## IV.I. АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Сістэмная дынаміка адукацыйнай дзейнасці прадугледжвае распрацоўку і рэалізацыю комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё шматузроўневай адукацыі, якая спалучае сучасныя падыходы да зместу, вучэбна-метадычнага, тэхналагічнага і інфармацыйнага забеспячэння існуючых і распрацоўкі новых адукацыйных праграм. Канкрэтныя мерапрыемствы заснаваны на спалучэнні лепшага айчыннага і замежнага вопыту і грунтуюцца на пастаянным павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў і актыўным уцягванні навучэнцаў у навуковую дзейнасць.

Важнымі інструментамі эфектыўнай рэалізацыі сучасных адукацыйных праграм з’яўляюцца: распрацоўка і рэалізацыя новай палітыкі ў адукацыйнай дзейнасці; маніторынг запатрабаванасці адукацыйных праграм і выпускнікоў на айчынным і міжнародным рынках адукацыйных паслуг, а таксама міжнародныя акрэдытацыі адукацыйных праграм.

Для дасягнення стратэгічнай мэты Праграмы ў сферы адукацыйнай дзейнасці спатрэбіцца рашэнне наступных задач.

### *IV.I.I. Удасканаленне сістэмы вышэйшай адукацыі*

*Стратэгічная мэта* – удасканаленне сістэмы вышэйшай адукацыі за кошт узмацнення вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў, шырокага ўкаранення новых інфармацыйных тэхналогій, развіцця сістэмы бесперапыннай адукацыі.

*Віды дзейнасці.*

– Задавальненне попыту на высокакваліфікаваных спецыялістаў шляхам адкрыцця падрыхтоўкі па новых перспектыўных напрамках і спецыяльнасцях у галіне культуры.

– Абнаўленне і ўдасканаленне інавацыйных адукацыйных тэхналогій з выкарыстаннем прынцыпаў бесперапыннай шматузроўневай адукацыі: давузаўская падрыхтоўка, вышэйшая адукацыя (спецыялісты, магістры), паслявузаўская адукацыя (аспіранты, дактаранты), дадатковая адукацыя (другая вышэйшая адукацыя, павышэнне кваліфікацыі і прафесійная перападрыхтоўка, дадатковая кваліфікацыя). Стварэнне гібкай сістэмы ўзгаднення адукацыйных праграм рознага ўзроўню, што забяспечвае пашырэнне доступу да розных узроўняў адукацыі і высокую якасць падрыхтоўкі.

– Распрацоўка інавацыйных падыходаў да навучання. Комплекснае развіццё інфармацыйнага сэрвісу. Інтэнсіўнае ўкараненне адукацыйных і камунікатыўных інтэрнэт-тэхналогій, забеспячэнне электроннымі вучэбнымі матэрыяламі ўсіх дысцыплін. Узмацненне ролі самастойнай працы студэнтаў і ўдасканаленне кантролю ведаў студэнтаў на ўсіх этапах навучання на аснове інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, скарачэнне ў вучэбных планах аб’ёму аўдыторных заняткаў.

– Стварэнне рэсурсных цэнтраў як важных элементаў інфраструктуры для інавацыйнага развіцця і фарміравання сістэмы даступнасці інтэлектуальнага патэнцыялу ўніверсітэта дзеля рашэння адукацыйных, навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных задач – структурных падраздзяленняў, аснашчаных сучасным тэхнічным абсталяваннем:

– вучэбны рэсурсны цэнтр гуказапісу і аранжыроўкі праграм;

– міждысцыплінарны рэсурсны цэнтр у галіне мастацтвазнаўства і культуралогіі;

– вучэбны комплекс тэле- і радыёвяшчання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– цэнтр развіцця народных рамёстваў;
– вучэбны лінгафонны цэнтр;
– цэнтр прымянення вылічальнай тэхнікі ў гуманітарных даследаваннях.

– Удасканаленне сістэмы планавання вучэбнай нагрузкі і аплаты працы выкладчыкаў шляхам аптымізацыі вучэбнага працэсу паводле крытэрыю «якасць – затраты»; развіццё новых механізмаў фінансавання адукацыйнай дзейнасці падраздзяленняў. Стварэнне эфектыўнай сістэмы кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу ўніверсітэта. Стварэнне ўмоў для замацавання маладых выкладчыкаў і абнаўленне праграм павышэння кваліфікацыі.

– Умацаванне пазіцый універсітэта на міжнародным рынку адукацыйных паслуг праз удасканаленне адукацыйных праграм. Распрацоўка праграм падрыхтоўкі магістраў на замежных мовах. Прадастаўленне больш шырокіх магчымасцей студэнтам у вывучэнні замежных моў.

### *IV.I.II. Удасканаленне інфармацыйнага суправаджэння адукацыйнага працэсу*

*Стратэгічная мэта* – удасканаленне інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнага працэсу і дасягненне новай якасці адукацыйнай дзейнасці за кошт укаранення новых інфармацыйных тэхналогій.

*Віды дзейнасці.*

– Дасягненне поўнай забяспечанасці сучаснай вучэбнай і навуковай літаратурай, у тым ліку – на электронных носьбітах.

– Развіццё і ўдасканаленне карпаратыўнай сеткі ўніверсітэта.

– Рэалізацыя і падтрымка сістэмы аддаленага доступу, што забяспечвае аўтарызаваны доступ да інфармацыі, неабходнай у вучэбным працэсе, і пашырэнне магчымасці доступу да фондаў сусветных культурных каштоўнасцей у сетцы Інтэрнэт, стварэнне ўмоў для развіцця дыстанцыйнага навучання.

– Стварэнне мультымедыйных адукацыйных рэсурсаў; фарміраванне сістэмы вучэбных паточных аўдыторый, аснашчаных тэхнічнымі сродкамі мультымедыя.

– Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і іншых катэгорый работнікаў у галіне выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе для рэалізацыі інавацыйных праграм, стварэння і выкарыстання электроннага забеспячэння вучэбнага працэсу ў адпаведнасці з патрабаваннямі ГОСТ 7.83 – 2001, якія прад’яўляюцца да электронных выданняў.

– Распрацоўка механізма падтрымкі выкладчыкаў, якія ствараюць і ўкараняюць у методыку выкладання электронныя вучэбныя рэсурсы.

– Стварэнне вучэбна-метадычных распрацовак па інфармацыйным суправаджэнні адукацыйнага працэсу.

### *IV.I.III. Арганізацыя міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі*

*Стратэгічная мэта* – умацаванне аўтарытэту ўніверсітэта на міжнароднай арэне і дасягненне статусу міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра.

*Віды дзейнасці.*

– Актывізацыя прапаганды дасягненняў і магчымасцей універсітэта ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай дзейнасці праз удзел у міжнародных выстаўках, арганізацыю інтэрнэт-канферэнцый па навуковых, адукацыйных і метадычных праблемах, публікацыі ў вядучых сусветных выданнях.

– Развіццё партнёрскіх сувязей з вядучымі замежнымі адукацыйнымі і навуковымі цэнтрамі праз удзел у міжнародных праграмах і праектах, акадэмічныя абмены студэнтамі, выкладчыкамі, аспірантамі.

– Забеспячэнне ўзаемнага прызнання адукацыйных праграм у партнёрскіх ВНУ. Стварэнне ўмоў для экспарту адукацыйных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## IV.II. НАВУКОВАЯ І ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Інструментамі павышэння эфектыўнасці правядзення навуковых даследаванняў стануць стварэнне сістэмы планавання і падтрымкі навуковай і інавацыйнай дзейнасці, заснаванай на аб'ектыўных навукаметрычных паказчыках, а таксама аптымізацыя і пашырэнне працэдур конкурсаў для вызначэння прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў.

Маніторынг развіцця сучаснай навукі і ўключэнне ўніверсітэцкіх вучоных у работу па перспектыўных навуковых напрамках прывядуць да пашырэння кола партнёраў сярод універсітэтаў, навуковых цэнтраў і інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама да павышэння актыўнасці ў міжнародных даследчых праектах.

Ключавымі ў гэтай сферы з'яўляюцца: фарміраванне супольнасці ўніверсітэцкіх экспертаў у галінах ведаў, паводле якіх ва ўніверсітэце здзяйсняюцца навуковая і адукацыйная дзейнасць; распрацоўка методык правядзення экспертыз з выкарыстаннем навуковага патэнцыялу ўніверсітэта; распрацоўка і рэалізацыя адукацыйных праграм прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі экспертаў. Рашэнне гэтых пытанняў дазволіць Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў выконваць функцыі экспертнай установы для Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэгіянальных органаў улады, зацікаўленых устаноў і арганізацый.

Сістэмнае развіццё навукова-інавацыйнай дзейнасці прадугледжвае:

– удасканаленне сістэмы планавання і падтрымкі навуковай і інавацыйнай дзейнасці;

– распрацоўку і рэалізацыю падыходаў да актуалізацыі тэматыкі даследаванняў у фундаментальнай і прыкладной навуцы;

– развіццё інавацыйнай дзейнасці;

– пашырэнне ўнутрыдзяржаўнай і міжнароднай кааперацыі ў навуковай дзейнасці;

– развіццё ўніверсітэцкай экспертнай супольнасці.

Для дасягнення стратэгічнай мэты Праграмы ў сферы навукова-інавацыйнай дзейнасці патрабуецца рашэнне наступных задач.

### *IV.II.I. Удасканаленне навуковай дзейнасці на шляху інавацыйнага развіцця*

*Мэта* – прапанаваць канструктыўныя ідэі і прынцыпы развіцця навукова-інавацыйнай дзейнасці ўніверсітэта, стварыўшы перадумовы для бесперапыннага павышэння ўзроўню навукова-метадычнага і навукова-тэхнічнага забеспячэння якасці адукацыі.

Навукова-інавацыйнае *развіццё* Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прадугледжваецца па трох кірунках:

– генерыраванне новых ідэй для карэкціроўкі культурнай палітыкі;

– стварэнне новых ведаў аб культуры для навукі і адукацыі;

– падрыхтоўка спецыялістаў з новымі прафесійнымі кампетэнцыямі для працы ў розных галінах сферы культуры.

Навукова-інавацыйная *дзейнасць* вызначаецца трыма важнейшымі кірункамі:

– навуковае, навукова-метадычнае і навукова-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу;

– навукова-даследчая работа;

– стварэнне рыначна-арыентаваных механізмаў рэалізацыі інавацыйных ідэй і праектаў, якія прадугледжваюць стварэнне канкурэнтаздольнага рыначнага прадукту.

Пры выбары прыярытэтаў, што тычацца навуковых напрамкаў дзейнасці ўніверсітэта, трэба ўлічваць патрэбнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у правядзенні прыкладных даследаванняў (у тым ліку даследаванняў апераджальнага характару) для фарміравання збалансаванай культурнай палітыкі.

### *IV.II.II. Выкананне заданняў раздзела «Навуковае забеспячэнне сферы культуры» дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Галоўная мэта* дзяржаўнай праграмы – павышэнне сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці функцыянавання галіны культуры.

*Задача* раздзела «Навуковае забеспячэнне сферы культуры» дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)» заключаецца ў правядзенні навуковых даследаванняў фундаментальнага і прыкладнога характару па актуальных пытаннях развіцця сферы культуры. Да прыярытэтных даследаванняў належыць аднесці *прыкладныя* даследаванні, накіраваныя на стварэнне і ўдасканаленне навукова абгрунтаваных механізмаў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, у тым ліку:

– вызначэнне ўздзеяння культуры на ўсе сферы грамадскага жыцця, уключаючы эканоміку;

– вызначэнне асаблівасцей дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры ў эпоху глабалізацыі;

– стварэнне аптымальных сацыякультурных умоў развіцця асобы;

– правядзенне даследаванняў, звязаных з рэалізацыяй праектаў па вывучэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны;

– здзяйсненне даследаванняў па пытаннях сацыякультурнага праектавання, развіцця індустрыі культуры, распрацоўкі і ўдасканалення маркетынгавых стратэгій прасоўвання прадуктаў і паслуг у сферы культуры;

– правядзенне сацыялагічных даследаванняў у сферы культуры.

### *IV.II.III. Выкананне планавых навуковых тэм калектывамі кафедраў універсітэта*

У перыяд з 2011 па 2015 г. у адпаведнасці з планам навукова-даследчых работ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па тэме «Культурная бяспека ва ўмовах глабалізацыі: дзейнасць устаноў культуры Рэспублікі Беларусь па захаванні культурнай спадчыны» запланаваны даследаванні па наступных навуковых кірунках:

– нацыянальная культура Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі;

– захаванне нацыянальнага мастацтва ва ўмовах глабалізацыі;

– дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь па захаванні і распаўсюджанні дакументальнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі;

– сацыякультурная дзейнасць і захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны;

– даследаванне і выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у навучальным працэсе ва ўмовах глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *IV.II.IV. Забеспячэнне функцыянавання навуковых школ*

Работа навуковых школ у новым пяцігоддзі прадвызначае пашырэнне і актуалізацыю тэматыкі праводзімых даследаванняў у адпаведнасці з прыярытэтнымі кірункамі развіцця нацыянальнай культуры.

Навуковая школа ў галіне культуралогіі «Сусветная і айчынная культура» ў будучай пяцігодцы завяршыць даследаванні па этнагенезе і культуры беларусаў, этнакультурным памежжы і беларускай ідэнтычнасці ва ўмовах глабалізацыі. Будзе працягнута работа па праблемах культуры гендэрных адносін у Беларусі, трансфармацыі статусу рэлігійнасці ў культуры інфармацыйнага грамадства і інш.

У рамках дзейнасці навуковай школы ў галіне педагогікі «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» будзе працягнута даследаванне такіх праблем, як развіццё крэатыўнасці школьнікаў і студэнтаў сродкамі сацыякультурнай дзейнасці, захаванне нацыянальнай культурна-даследчай спадчыны, падрыхтоўка спецыялістаў культурна-стваральнай і культурна-ахоўнай дзейнасці ва ўстановах культуры, фарміраванне экалагічнай культуры асобы і інш.

У рамках дзейнасці навуковай школы ў галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» будуць праводзіцца даследаванні па гісторыі беларускай бібліяграфіі, па пашырэнні інфармацыйнай культуры асобы, падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў і г.д.

Навуковая школа ў галіне мастацтвазнаўства «Кампаратыўнае мастацтвазнаўства» будзе працягваць канцэптуалізацыю тэарэтычных і метадалагічных праблем новай навуковай галіны – кампаратыўнае мастацтвазнаўства, у рамках якой мяркуецца разглядаць стратэгіі развіцця тэхнагеннага, экраннага, музычна-тэатральнага мастацтва, а таксама сучасных візуальна-мастацкіх практык.

### *IV.II.V. Функцыянаванне саветаў па абароне дысертацый і праблемных саветаў*

На працягу 2011–2015 гг. плануюцца абароны 42 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый. Саветы па абароне дысертацый з'яўляюцца важным кампанентам сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, накіраваным на ўзнаўленне і нарошчванне інтэлектуальнага патэнцыялу прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта.

Галоўныя задачы дысертацыйных саветаў на будучую пяцігодку:

– правядзенне аб'ектыўнай і кваліфікаванай экспертызы дысертацыі;

– правядзенне пераатэстацыі ўладальнікаў кваліфікацыйных дакументаў аб вучонай ступені, выдадзеных у замежных дзяржавах;

– разгляд пытанняў пазбаўлення (аднаўлення) вучонай ступені.

Асноўныя задачы, якія ўскладваюцца на праблемныя саветы ўніверсітэта:

– забяспечыць выкананне навуковых прац у рамках зацверджанай тэматыкі навуковых даследаванняў па каардынуемай праблеме;

– уносіць прапановы па перспектыўных навуковых даследаваннях;

– абмяркоўваць справаздачы аб ходзе выканання НДР;

– здзяйсняць экспертызу вынікаў навуковай дзейнасці;

– абмяркоўваць рукапісы падрыхтаваных профільных выданняў для выпрацоўкі рэкамендацыі да друку;

– праводзіць работу па апаніраванні дысертацыйных даследаванняў, накіраваных ва ўніверсітэт з іншых ВНУ рэспублікі.

### *IV.II.VI. Арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў (НДРС), удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых прац*

У 2011–2015 гг. плануецца развіваць практыку куратарства таленавітых студэнтаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай дзейнасці, вядучымі вучонымі і спецыялістамі. Асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца адбору будучых аспірантаў з ліку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лепшых студэнтаў 2–3-х курсаў усіх факультэтаў. Пры гэтым павінна захоўвацца пераемнасць зместу курсавых і дыпломных прац, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Правядзенне штогадовых навуковых канферэнцый студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў павінна завяршацца публікацыяй лепшых дакладаў.

Будзе працягвацца работа студэнцкіх навуковых гурткоў і аб'яднанняў.

Перспектывы развіцця НДРС будуць звязаны з:

– больш інтэнсіўным стымуляваннем навукова-даследчай і самастойнай работы студэнтаў;

– устанаўленнем кантактаў з рэдакцыямі навукова-практычных часопісаў з мэтай апублікавання вынікаў НДРС;

– прыцягненнем студэнтаў да ўдзелу ў навуковых канферэнцыях, у работе Савета маладых вучоных Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;

– стварэннем міжкафедральных навуковых суполак.

Актыўнаму ўключэнню лепшых студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў у навукова-даследчую дзейнасць будзе садзейнічаць уцягванне іх у работу над комплекснымі навукова-даследчымі тэмамі кафедраў і выкананне заданняў дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (2011–2015 гг.)» і навукова-даследчых тэм НТЛ універсітэта.

### *IV.II.VII. Арганізацыя работы Савета маладых вучоных універсітэта*

Асноўнымі мэтамі дзейнасці Савета маладых вучоных з'яўляюцца: актывізацыя прафесійнага росту маладых вучоных; аб'яднанне іх намаганняў для распрацоўкі актуальных навуковых праблем і рашэння прыярытэтных навуковых задач, а таксама развіцця інавацыйнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі новага пяцігоддзя з'яўляюцца:

– прапаганда навейшых дасягненняў навукі ў асяроддзі моладзі;

– стварэнне ўмоў для прафесійнага росту і павышэння сацыяльнай актыўнасці маладых вучоных;

– удасканаленне формаў удзелу маладых вучоных у даследчых праектах, навуковых грантах, школах, конкурсах, праграмах, стажыроўках, у распрацоўках фундаментальных і прыкладных даследаванняў;

– фарміраванне і пашырэнне сеткі кантактаў з саветамі маладых вучоных іншых навуковых арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў;

– папулярызацыя выдатных дасягненняў маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта.

### *IV.II.VIII. Удасканаленне выдавецкай дзейнасці*

Прыярытэтныя задачы ў галіне выдавецкай дзейнасці ў будучым пяцігоддзі:

– удасканаленне выдавецкай дзейнасці ў мэтах забеспячэння ўмоў далейшага развіцця беларускай навукі і культуры;

– укараненне навейшых тэхналогій дадрукарскай падрыхтоўкі і паліграфіі, павышэнне выяўленчай і зместавай культуры выданняў;

– павышэнне даходнасці рэдакцыйна-выдавецкага комплексу;

– стварэнне механізма акупнасці выдавецкіх праектаў, выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

## IV.III. ІДЭАЛАГІЧНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА З МОЛАДДЗЮ

Вышэйшая навучальная ўстанова аказвае значны ўплыў на ўмацаванне духоўнага і інавацыйнага патэнцыялу беларускага грамадства. Грамадзянскія, асобасныя якасці выпускнікоў універсітэта, іх прафесійная кампетэнтнасць, светапогляд і каштоўнасныя арыентацыі аказваюць непасрэднае ўздзеянне на масавае ўсведамленне і паводзіны, з'яўляюцца важнай перадумовай духоўна-маральнага здароўя і дабрабыту дзяржавы.

Сістэма ідэалагічнай работы ва ўніверсітэце ўяўляе сукупнасць кіраўніцкіх структур, службовых асоб, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, грамадскіх арганізацый і органаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнцкага самакіравання, адносін і дзеянняў, каштоўнасных імператываў, функцый, нормаў і рэсурсаў, якія забяспечваюць практычнае вырашэнне ідэалагічных, культурна-выхаваўчых задач. Суб'екты ідэалагічнага працэсу надзелены ва ўстаноўленым парадку паўнамоцтвамі згодна з кампетэнцыяй і роляй у механізме ідэалагічнага ўплыву на ўсведамленне і паводзіны студэнтаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў і супрацоўнікаў універсітэта.

### *IV.III.I. Прынцыпы арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Палітыка ўніверсітэта ў сферы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце паходзіць з пераемнасці мэт і прыярытэтаў, што былі сфарміраваны і рэалізоўваліся ў папярэднія гады. Асноватворнымі прынцыпамі работы ў будучым пяцігоддзі будуць:

– арганізацыя грамадзянскага выхавання студэнтаў на падставе ідэй і каштоўнасцей, што складаюць змест ідэалогіі беларускай дзяржавы;

– далучэнне студэнтаў да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, стваральнай творчасці з улікам ідэалагічных фактараў, гісторыка-культурных традыцый і асаблівасцей менталітэту беларускага народа;

– строгае выкананне палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншых нарматыўных прававых актаў, рэгулюючых адносіны ў сістэме вышэйшай адукацыі;

– адзінства адукацыйных і выхаваўчых задач;

– дэмакратычнасць узаемадзеяння педагогаў і студэнтаў, якая выяўляецца ў даверы, узаемадапамозе, садружнасці, партнёрстве, плюралізме думак і перакананняў;

– стварэнне рэальных умоў, выхаваўчага асяроддзя, якія садзейнічаюць зніжэнню колькасці правапарушэнняў, што перашкаджае распаўсюджанню ў асяроддзі моладзі негатыўных сацыяльных з'яў;

– задавальненне духоўна-маральных запытаў асобы з улікам індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей.

У кантэксце стратэгічнай мэты Праграмы развіцця ўніверсітэта на 2011–2015 гг. сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце прызвана садзейнічаць:

– усведамленню студэнтамі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі, кіраўнікамі значнасці ідэалогіі дзяржавы як сродку якаснай, цывілізаванай, стратэгічна і тэхналагічна абгрунтаванай перабудовы ўсіх сфер жыцця беларускага грамадства;

–ператварэнню ў жыццё ідэі, апрабаванай практыкай сацыяльнай трансфармацыі: «Моцная дзяржава – квітнеючая Беларусь»;

– засваенню кожным студэнтам ролі духоўна-ідэалагічных фактараў у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, сацыяльным кіраванні, самаразвіцці і задавальненні патрабаванняў асобы;

– стварэнню сістэмы выхаваўчых, гэта значыць сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і арганізацыйных мер, накіраваных на выяўленне, устараненне ці нейтралізацыю прычын і ўмоў, што садзейнічаюць правапарушэнням, на вядзенне актыўнай барацьбы з антыграмадскімі паводзінамі, перавыхаванне парушальнікаў сацыяльных нормаў;

– павышэнню якасці адукацыі, сацыяльна-асобаснай кампетэнтнасці выпускнікоў універсітэта, іх здольнасці дзейнічаць у бесперапынна зменлівых умовах з пазіцый інтарэсаў нацыянальнай дзяржаўнасці.

### *IV.III.II. Мэта і задачы ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Асноўнымі мэтамі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце з'яўляюцца: фарміраванне эфектыўнай сістэмы грамадзянскага выхавання студэнтаў універсітэта; забеспячэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва, адэкватнай нацыянальным інтарэсам, выклікам і запатрабаванням веку, інфармацыі, высокім тэхналогіям, зменам у сучасным свеце.

*Задачы* ідэалагічнай і выхаваўчай работы на будучае пяцігоддзе:

– стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць студэнцкай моладзі глыбокае авалоданне духоўна-ідэалагічнымі каштоўнасцямі і палітыкай беларускай дзяржавы, падахвочваючых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобу да адказных учынкаў, добрасумленнага выканання прафесійнага абавязку, гуманных адносін да людзей, творчай працы, усвядомленага выбару здаровага ладу жыцця;

– рэалізацыя комплексу мер, накіраваных на фарміраванне сацыяльна эфектыўнай сістэмы ідэалагічнай работы, яе інфармацыйна-аналітычнае, кадравае і метадычнае забеспячэнне;

– мэтанакіраванае фарміраванне ўменняў прадуктыўнага выкарыстання атрыманых ідэалагічных ведаў і навыкаў у прафесійнай дзейнасці і міжасобасных зносінах;

– выхаванне ў кожнага будучага спецыяліста ў галіне культуры непрымання нацыяналістычных, экстрэмісцкіх і іншых дэструктыўных поглядаў і дзеянняў, што наносяць шкоду інтарэсам дзяржавы і грамадства;

– удзел прафесарска-выкладчыцкага складу ў фарміраванні і навуковым развіцці ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, абгрунтаванні тэхналогій яе практычнай рэалізацыі ў сферы нацыянальнай культуры.

### *IV.III.III. Механізм рэалізацыі задач ідэалагічнай і выхаваўчай работы*

Рэалізацыя задач Праграмы ў сферы ідэалагічнай і выхаваўчай работы забяспечваецца праз:

– растлумачэнне студэнтам, выкладчыкам, супрацоўнікам, кіраўнікам метадамі пераканальнай камунікацыі ідэалогіі і палітыкі дзяржавы;

– планамернае і сістэматычнае інфармаванне калектыву ўніверсітэта аб найбольш важных падзеях у свеце і краіне, палітычных, эканамічных мерах кіраўніцтва рэспублікі па вырашэнні грамадскіх праблем, сацыяльнай эфектыўнасці інстытутаў дзяржаўнай улады;

– арганізацыю і правядзенне тэматычных сустрэч калектыву ўніверсітэта з членамі ўрада, дэпутатамі, знанымі вучонымі, кіраўнікамі вытворчасці, дзеячамі мастацтва і культуры;

– прадстаўленне выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў за канкрэтныя вынікі сацыяльна карыснай дзейнасці да дзяржаўных, ведамасных узнагарод і падтрымкі, прыняцце іншых мер матэрыяльнага і маральнага стымулявання добрасумленнай працы;

– арганізацыю ўрачыстых мерапрыемстваў у сувязі з дзяржаўнымі і прафесійнымі святамі, ушанаваннем членаў калектыву, юбілейнымі і іншымі знамянальнымі датамі ў жыцці рэспублікі і ўніверсітэта;

– рэалізацыю мер па падвышэнні ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту супрацоўнікаў і пенсіянераў, паляпшэнні іх жыллёвых умоў, медыцынскага абслугоўвання, санаторнага лячэння, сацыяльнай абароне членаў сям'і;

– арганізацыю і правядзенне ў рамках дзяржаўна-патрыятычнага, прафесійна-працоўнага, маральна-эстэтычнага выхавання культурна-дасугавых, фізкультурна-аздараўленчых і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на прапаганду здаровага ладу жыцця сярод студэнтаў і работнікаў універсітэта.

Механізм рэалізацыі Праграмы прадугледжвае планамернае развіццё ў струдэнтаў пазітыўных асобасных якасцей, засваенне імі дзяржаўных інтарэсаў, прыярытэтаў і каштоўнасцей як матываў паўсядзённых паводзін і прафесійнай дзейнасці.

### *IV.IV. Дзейнасць мастацкіх калектываў*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў арганізуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з класічнымі падыходамі ўніверсітэцкай адукацыі на аснове прынцыпаў адзінства адукацыйнай, навуковай і творчай дзейнасці, сувязі навукова-педагагічнага працэсу з практыкай. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, асноўнымі задачамі ў галіне творчай дзейнасці ўніверсітэта трэба лічыць:

– удасканаленне і набыццё студэнтамі прафесійных уменняў і навыкаў;

– рэалізацыю створаных падчас адукацыйнага працэсу праграм і творчых праектаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– апрабацыю і асваенне культурна-дасугавых тэхналогій, новых методык мастацка-творчай дзейнасці.

Эфектыўная і апрабаваная практыкай форма станаўлення паўнавартаснай творчай асобы – удзел у студэнцкіх мастацкіх калектывах, асноўнымі задачамі дзейнасці якіх вызначаюцца:

– задавальненне патрэбнасцей асобы ў атрыманні вышэйшай адукацыі, яе інтэлектуальным, маральным, культурным развіцці на аснове адзінства вучэбнага працэсу і мастацка-творчай дзейнасці;

– культурна-дасугавае абслугоўванне насельніцтва;

– актыўная канцэртная дзейнасць, накіраваная на эстэтычнае выхаванне і прапаганду дасягненняў нацыянальнай культуры.

Механізмам рашэння пастаўленых задач і падвышэння эфектыўнасці канцэртнай дзейнасці мастацкіх калектываў з'яўляецца комплексная маркетынгавая стратэгія творчай дзейнасці ўніверсітэта, якая ўключае:

– правядзенне даследаванняў па вывучэнні патэнцыяльных і фактычных арт-рынкаў, вопыту іх работы, выяўленне і аналіз дынамікі попыту на сацыякультурныя паслугі;

– распрацоўку, абгрунтаванне мэтазгоднасці рэалізуемых творчых праектаў, накіраваных на фарміраванне сацыяльна значных культурна-эстэтычных каштоўнасцей;

– аптымізацыю камерцыйнай дзейнасці ў сферы культуры і мастацтва, у тым ліку для паступовага пераходу мастацкіх калектываў на самаакупнасць;

– стварэнне і актуалізацыю камплекта прадстаўнічай і рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі мастацкіх калектываў універсітэта (аўдыявізуальная, друкаваная і іншая прома-прадукцыя);

– прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання творчых праектаў, стымуляванне суб'ектаў па прыцягненні спонсараў, мецэнатаў, партнёраў, прамоўтараў.

### *IV.V. Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі*

У кантэксце Праграмы развіцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мэтай інфарматызацыі з'яўляецца стварэнне аптымальных умоў для падвышэння якасці адукацыі, навуковай і творчай дзейнасці, работы кіраўніцкіх структур шляхам укаранення ў практыку, суправаджэння і развіцця інфармацыйных сістэм і тэхналогій.

У будучым пяцігоддзі мяркуецца рашэнне практычных задач інфарматызацыі па асноўных напрамках дзейнасці ўніверсітэта.

### *IV.V.I. Інфарматызацыя вучэбнага працэсу*

Інфарматызацыя вучэбнага працэсу з'яўляецца прыярытэтнай мэтай, якая забяспечвае якасна новы ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў усіх напрамкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўныя задачы ў галіне інфарматызацыі вучэбнага працэсу:

– шырокае ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у вучэбны працэс;

– удасканаленне інфармацыйнага абслугоўвання, рэгулярнае абнаўленне парку тэхнічных сродкаў навучання;

– распрацоўка, набыццё, укараненне праграмнага забеспячэння для стварэння электронных вучэбных матэрыялаў, развіццё новых формаў і метадаў выкладання з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій (у тым ліку дыстанцыйнай адукацыі).

Для рашэння гэтых задач неабходна:

– паэтапна фарміраваць сучасную праграмна-тэхнічную базу ўніверсітэта;

– прадоўжыць стварэнне і наступнае напаўненне сайтаў факультэтаў неабходнай інфармацыяй для забеспячэння вучэбнага працэсу: вучэбныя планы па спецыяльнасцях, тыпавыя і вучэбныя праграмы, праграмы практыкі, метадычнае забеспячэнне курсаў (электронныя вучэбныя матэрыялы па дысцыплінах);

– прадоўжыць напаўненне электронных адукацыйных баз даных (база інфармацыйных рэсурсаў);

– стварыць кансультацыйную групу па тэхнічным садзейнічанні прафесарска-выкладчыцкаму складу ў стварэнні электронных падручнікаў, дапаможнікаў, кантралюючых праграм;

– прадоўжыць укараненне інфармацыйнай сістэмы падтрымкі самастойнай работы студэнтаў, прадугледзець магчымасці абмену электроннымі вучэбнымі матэрыяламі, тэсціраванне, кантроль выканання планаў праходжання дысцыплін, кансультацыйную падтрымку з выкарыстаннем тэхналогій дыстанцыйнай адукацыі.

### *IV.V.II. Інфарматызацыя навуковай дзейнасці*

Інфарматызацыю навуковай дзейнасці належыць весці наступным чынам:

– пастаянна абнаўляць раздзел сайта «Навука» ва ўніверсітэце з абавязковым увядзеннем раздзелаў: «Банк даных навуковых і навукова-практычных канферэнцый, семінараў», «Дэпазітарый навуковых работ выкладчыкаў, супрацоўнікаў і аспірантаў»;

– адпрацаваць тэхналогію камерцыялізацыі навуковых распрацовак (стварыць базу даных інавацыйных праектаў і крыніц іх фінансавання);

– стварыць базу даных аспірантаў, суіскальнікаў і дактарантаў універсітэта.

### *IV.V.III. Развіццё аўтаматызаваных сістэм*

Мэта інфарматызацыі ў гэтай сферы – удасканаленне арганізацыйных формаў і метадаў кіравання рознымі працэсамі ўніверсітэта на ўсіх узроўнях шляхам развіцця аўтаматызаваных сістэм кіравання.

Развіццё аўтаматызаваных сістэм павінна забяспечыць рашэнне практычных *задач:*

– фарміраванне інфармацыйных, арганізацыйна-кіраўніцкіх і нарматыўных баз даных;

– забеспячэнне на рабочым месцы кіраўнікоў універсітэта, факультэтаў, кафедраў, лабараторый, кіраўніцкіх службаў і іншых структурных падраздзяленняў інфармацыяй, неабходнай і дастатковай для прыняцця аптымальных рашэнняў на сваім узроўні;

– аўтаматызацыя часткі кіраўніцкай дзейнасці, звязанай з выкананнем руцінных аперацый, а таксама рашэннем задач аўтаматызацыі стандартных службовых аперацый, інфармацыйнай падтрымкі функцыянавання ВНУ і яго падраздзяленняў, планавання і справаздачнасці.

Для рэалізацыі пастаўленых задач мяркуецца стварыць і ўкараніць адкрытую інфармацыйна-даведачную базу ўніверсітэта, якая ўключае раздзелы:

– электронныя варыянты тыпавых узораў улікова-справаздачных дакументаў універсітэта (па вучэбна-выхаваўчай рабоце і навуцы) з адпаведнымі інструкцыямі і патрабаваннямі;

– нарматыўныя дакументы Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры;

– навукова-даследчая работа;

– інфармацыйна-даведачная база СМК;

– падсістэма «Разлік нагрузкі»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– падсістэма «Электронны расклад»;

– падсістэма «Электронны дакументаабарот»;

– падсістэма па ўліку, рэгістрацыі, выдачы пластыкавых дакументаў на аснове смарт-карт «Смарт-дакумент»;

– падсістэма «Кіраванне ўніверсітэтам», якая ўключае сістэму «Студэнты».

### *IV.V.IV. Развіццё электроннай бібліятэкі*

Мэта інфарматызацыі бібліятэкі – падвышэнне якасці інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі за кошт новых інфармацыйных тэхналогій, заснаваных на прымяненні электронных тэхнічных сродкаў.

На будучы перыяд акрэслены наступныя *задачы*:

– інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў шляхам прадастаўлення аддаленага доступу да інфармацыі аб бібліятэчных фондах універсітэта;

– аўтаматызацыя працэсу кнігавыдачы;

– фарміраванне паўнатэкставых электронных калекцый.

Для рашэння гэтых задач мяркуецца:

– завяршыць аўтаматызацыю працэсу кнігавыдачы: набыць абнаўленне для АБІС МАРК-SQL; набыць і ўкараніць сістэму, заснаваную на RFID тэхналогіі, для арганізацыі электроннай выдачы/вяртання кніг на абанеменце вучэбнай літаратуры;

– удасканальваць інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі: змясціць на сайце бібліятэкі электронны каталог, арганізаваць сістэму электроннага заказу літаратуры; прадаставіць супрацоўнікам універсітэта аддалены доступ да электроннага каталогу бібліятэкі і наяўным паўнатэкставым базам даных;

– сфарміраваць паўнатэкставыя электронныя калекцыі: стварыць Цэнтр аблічбоўкі для электронных паўнатэкставых калекцый; сфарміраваць Базу даных паўнатэкставых калекцый навуковых прац супрацоўнікаў універсітэта па напрамках; сфарміраваць паўнатэкставую Базу даных вучэбна-метадычных дапаможнікаў універсітэта.

### *IV.V.V. Развіццё тэлекамунікацыйнай інфраструктуры*

Асноўнымі мэтамі развіцця тэлекамунікацыйнай інфраструктуры з'яўляецца павелічэнне ёмістасці наяўных і пабудовы новых каналаў перадачы даных для падвышэння якасці і пашырэння спісу прадастаўляемых паслуг.

Для дасягнення гэтых мэт неабходна рашыць задачы:

– развіцця ЛВС універсітэта на аснове тэхналогіі Wi-Fi;

– павелічэння прапускной здольнасці знешняга канала доступу ў Інтэрнэт.

### *IV.V.VI. Развіццё аддзела тэхнічных сродкаў навучання*

Адным з найбольш перспектыўных напрамкаў у адукацыі з'яўляецца прымяненне камп'ютарных тэхналогій. Укараненне ТСН у вучэбны працэс патрабуе рашэння наступных задач:

– набыццё сучасных тэхнічных сродкаў навучання і абсталяванне імі вучэбных аўдыторый універсітэта;

– павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў аддзела;

– фарміраванне сучасных комплексаў ТСН;

– стварэнне электроннага каталогу тэхнічных сродкаў, прадастаўляемых аддзелам ТСН, для забеспячэння вучэбнага працэсу;

– завяршэнне работ па кадзіраванні аналагавых аўдыя- і відэаматэрыялаў, прадастаўленых у лічбавым фармаце;

– стварэнне электроннага каталогу лічбавага аўдыя-, відэафонду.

### *IV.V. VII. Развіццё інтэрнэт-рэсурсу ўніверсітэта*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтай стварэння спецыялізаванага інтэрнэт-рэсурсу адкрытага доступу з'яўляецца садзейнічанне фарміраванню і ўмацаванню партнёрскіх адносінаў і сувязей паміж універсітэтам і грамадскасцю, у тым ліку і патэнцыяльнымі дабрачынцамі (выпускнікамі, бацькамі навучэнцаў, спонсарамі). Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна рашэнне наступных *задач*:

– стварэнне раздзела «Рэсурсы» на сайце ўніверсітэта з доступам па спасылках да інфармацыі аб агульнаадукацыйных установах у сферы культуры, асаблівасцях іх функцыянавання і развіцця;

– азнаямленне наведвальнікаў сайта з нарматыўна-прававымі дакументамі, якія тычацца юрыдычнага і фінансавага боку дабрачыннай дзейнасці;

– інфармаванне грамадскасці аб дабрачыннай дзейнасці і практыцы партнёрскіх адносінаў паміж вучэбнымі ўстановамі і іх выпускнікамі ў рэспубліцы і за мяжой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *IV.V.VIII. Развіццё праграмна-тэхнічнага комплексу*

Развіццё праграмна-тэхнічнага комплексу – гэта адзін з асноўных кампанентаў інфарматызацыі. У гэтым напрамку найбольш актуальныя наступныя *задачы*:

– павелічэнне колькасці камп’ютараў, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе і сістэме кіравання ВНУ, своечасовае абнаўленне ўстарэлай тэхнікі;

– развіццё лакальнай сеткі ўніверсітэта; прадугледжваецца падключэнне ў лакальную сетку 2-га вучэбнага корпуса, студэнцкіх інтэрнатаў;

– забеспячэнне ўсіх напрамкаў дзейнасці ўніверсітэта неабходным і дастатковым наборам ліцэнзійных праграмных прадуктаў, уключна набыццё дадатковай колькасці ліцэнзій і абнаўленне ўжо набытых ліцэнзійных праграмных прадуктаў;

– паслядоўнае ўкараненне інтэграванай тэлекамунікацыйнай сістэмы пропуску ў будынак універсітэта.

### *IV.VI. Міжнародная дзейнасць*

Мэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у галіне міжнароднай дзейнасці – умацаванне аўтарытэту ўніверсітэта на міжнароднай арэне і дасягненне статусу міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра.

У сферы міжнароднай дзейнасці запатрабуецца рашэнне наступных задач:

– інтэграцыя ўніверсітэта ў міжнародную акадэмічную прастору;

– развіццё партнёрскіх сувязей з вядучымі замежнымі адукацыйнымі і навуковымі цэнтрамі праз удзел у міжнародных праграмах і праектах, акадэмічныя абмены;

– умацаванне пазіцый на сусветным і нацыянальным рынках адукацыйных паслуг.

Для рашэння пастаўленых задач у наступным пяцігоддзі патрабуецца:

– стварэнне прывабнага для замежных студэнтаў і партнёраў іміджу ўніверсітэта. Сістэматычная інфармацыйна-рэкламная праца па распаўсюджванні за межамі Рэспублікі Беларусь пазітыўных звестак аб універсітэце, у прыватнасці яго навуковым і адукацыйным патэнцыяле;

– актыўны ўдзел у міжнародных навукова-адукацыйных канферэнцыях, выставах і іншых мерапрыемствах з мэтай папулярызацыі дасягненняў і патэнцыялу ўніверсітэта;

– удасканаленне інфармацыйнай падтрымкі міжнароднай дзейнасці, стварэнне англамоўнай версіі інтэрнэт-сайта ўніверсітэта як сродку інтэграцыі ў міжнародную навуковую і адукацыйную прастору;

– усталяванне новых і развіццё існуючых кантактаў з замежнымі вучэбнымі і навукова-даследчымі ўстановамі;

– фарміраванне спрыяльных умоў для далейшага развіцця экспарту адукацыйных паслуг і прыцягненне замежных студэнтаў;

– пераадоленне моўнага бар’ера ў зносінах з замежнымі грамадзянамі, распрацоўка і рэалізацыя мер па ўдасканаленні навучання рускай мове;

– выхаванне замежных грамадзян у духу павагі і трымання беларускіх традыцый і заканадаўства.

### *IV.VII. Кадравае забеспячэнне і кіраўніцкія тэхналогіі*

Адсутнасць эфектыўных кіраўніцкіх тэхналогій, арыентаваных на нацыянальную спецыфіку і асвоеных кіраўнікамі, прыводзіць да зніжэння тэмпаў рэалізацыі запланаваных праграм і праектаў. Для рашэння гэтай праблемы неабходна правесці ўкараненне прынцыпаў сучаснага прафесійнага менеджменту ў навуковай, адукацыйнай, выхаваўчай, творчай дзейнасці на аснове аналізу індывідуальных, сацыяльных і міжнародных аспектаў інавацыйнага развіцця.

У кадравай палітыцы мэтай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з’яўляецца стварэнне школы, арыентаванай на падрыхтоўку беларускай педагагічнай, навуковай, творчай, кіраўніцкай эліты, здольнай адказваць на выклікі эпохі глабалізацыі і інавацыйнага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах стварэння ўмоў для падрыхтоўкі нацыянальнай кіраўніцкай эліты, распрацоўкі і адаптацыі кіраўніцкіх тэхналогій плануецца фарміраванне адукацыйных праграм дадатковай прафесійнай адукацыі, інтэрнацыяналізацыя навукова-педагагічнага калектыву, развіццё інфраструктуры ўніверсітэта, у тым ліку бібліятэкі і інфармацыйных рэсурсаў.

Забеспячэнне дзейнасці па рэалізацыі палажэнняў Праграмы патрабуе мадэрнізацыі сістэмы кіравання ўніверсітэтам, у тым ліку распрацоўкі і ўкаранення рэгламентаў, баз даных, «электроннай адміністрацыі», аптымізацыі арганізацыйнай структуры і штатнага раскладу. Будуць пашыраны праграмныя ўзаемадзеянні з рэспубліканскімі і мясцовымі органамі дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь па выкананні шырокага спектра прыкладных даследаванняў у мэтах садзейнічання ў рашэнні дзяржаўных задач.

У вядучых універсітэтах свету аснову росту складае не толькі канцэнтрацыя вядучых вучоных і прыцягненне маладых кадраў, але і ўніверсальная сістэма доступу да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў. Плануецца стварэнне і забеспячэнне функцыянавання такой сістэмы, якая забяспечвае доступ да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў універсітэта ўсім зацікаўленым карыстальнікам.

Рэалізацыю прызначаных *задач* плануецца здзейсніць шляхам правядзення наступных мерапрыемстваў:

– развіццё сістэмы кіравання, стварэнне навуковых асноў сучасных кіраўніцкіх тэхналогій;

– стварэнне сістэмы падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў;

– стварэнне інфармацыйнай сістэмы для доступу да інтэлектуальных і інфармацыйных рэсурсаў універсітэта;

– стварэнне сістэмы маніторынга кадравага патэнцыялу і прагназаванне патрэбнасці ў навукова-педагагічных, кіраўніцкіх кадрах;

– прыцягненне ў вучэбны працэс навуковых супрацоўнікаў акадэмічных інстытутаў, вядомых вучоных, знаных спецыялістаў-практыкаў як з Беларусі, так і з-за мяжы;

– арганізацыя бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі, развіццё паслявузаўскай адукацыі, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, другой вышэйшай адукацыі;

– удасканаленне моўнай падрыхтоўкі студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў;

– работа з маладымі выкладчыкамі, падтрымка таленавітай студэнцкай моладзі;

– развіццё і ўдасканаленне сістэмы псіхалагічнага суправаджэння работы з персаналам, фарміраванне карпаратыўнай культуры;

– распрацоўка стымулюючых і матывацыйных механізмаў, накіраваных на падвышэнне ў супрацоўнікаў універсітэта зацікаўленасці і задаволенасці працай, яе ацэнкай і ўзроўнем аплаты.

### *IV.VII.I. Забеспячэнне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук)*

Асаблівае значэнне для кадравага забеспячэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мае працэс падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. З улікам заявак кафедраў універсітэта сфарміраваны перспектыўны план патрэбнасці ўніверсітэта ў навуковых кадрах вышэйшай кваліфікацыі да 2015 г. План набору ў аспірантуру на 2011–2015 гг. складае штогод 20 чалавек, у дактарантуру – 1 чалавек.

Для падвышэння эфектыўнасці сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў праз аспірантуру і дактарантуру неабходна ўдасканаленне ўзаемадзеяння з рэгіянальнымі ўпраўленнямі і ўстановамі культуры, адукацыі, іншымі ведамствамі. Развіццё інстытута мэтавага набору для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі дазволіць не толькі ўмацаваць сувязі ўніверсітэта з арганізацыямі культуры на месцах, але і аптымізаваць набор у аспірантуру на карысць кадравых патрэбнасцей універсітэта ў падрыхтоўцы выкладчыцкага саставу. У 2011–2015 гг. для ўніверсітэта плануецца штогадовая падрыхтоўка 6–8 аспірантаў, якія навучаюцца па кантрактах.

Адзін з найважнейшых паказчыкаў падвышэння эфектыўнасці працы аспірантуры – павелічэнне колькасці аспірантаў, якія прадстаўляюць ва ўстаноўлены тэрмін завершаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысертацыйныя даследаванні. У ліку пытанняў, што патрабуюць асаблівай увагі, – усебаковы аналіз абгрунтаванасці выбару тэматыкі дысертацыйных даследаванняў, іх максімальная адпаведнасць прыярытэтным кірункам фундаментальных і асабліва прыкладных даследаванняў. Не менш важнымі ўяўляюцца пытанні падвышэння персанальнай адказнасці навуковых кіраўнікоў і загадчыкаў кафедраў за правядзенне прамежкавай і падагульняючай атэстацыі, а таксама ўдасканаленне сістэмы папярэдняй экспертызы дысертацый у працэсе навучання на апошнім курсе аспірантуры.

### *IV.VII.II. Арганізацыя павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі, стажыровак супрацоўнікаў універсітэта*

Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў і праходжанне стажыровак супрацоўнікаў універсітэта адбываецца ў асноўным на базе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Рэспубліканскага інстытута інавацыйных тэхналогій, Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў фізічнай культуры, спорту і турызму, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у вядучых навучальных установах г. Мінска. Перападрыхтоўка вядзецца ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы на базе вышэйшай адукацыі з атрыманнем дыплома аб перападрыхтоўцы і з прысваеннем кваліфікацыі «Спецыяліст па педагагічным вымярэнні», «Спецыяліст па рабоце з моладдзю», «Спецыяліст па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце», «Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі», «Культуролаг, выкладчык культуралагічных дысцыплін».

У 2011 г. на базе ўніверсітэта будуць арганізаваны курсы «Інавацыйная адукацыя і сістэма кіравання якасцю ў ВНУ» і «Кампетэнтнасныя мадэлі падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ: тэорыя і практыка праектавання». Спецыяльна распрацаваныя праграмы дадуць магчымасць атрымаць неабходныя веды і задаволіць прафесійна-адукацыйныя патрэбнасці супрацоўнікаў і выкладчыкаў, абнавіць і падвысіць прафесійную кампетэнцыю.

Неабходна завяршэнне фарміравання базы даных для праходжання стажыровак і павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у краінах блізкага і далёкага замежжа на 2011–2015 гг.

### *IV.VIII. Матэрыяльна-тэхнічная база і інфраструктура ўніверсітэта*

Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы і інфраструктуры ўніверсітэта ў адпаведнасці з сучаснымі тэхналагічнымі патрабаваннямі з’яўляецца адной з асноўных умоў падвышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, узроўню навуковых даследаванняў, мастацка-творчай дзейнасці, эфектыўнасці кіраўніцкіх рашэнняў.

У ходзе рэалізацыі палажэнняў Праграмы неабходна сканцэнтраваць намаганні на рашэнні наступных асноўных *задач*:

– правядзенне своечасовых работ па рамонце ўніверсітэцкага комплексу будынкаў і капітальным будаўніцтве новых аб’ектаў;

– прыярытэтнае матэрыяльна-тэхнічнае і гаспадарчае забеспячэнне дзейнасці вучэбных, навуковых, выхаваўчых структурных падраздзяленняў;

– забеспячэнне сацыяльна-бытавых умоў у студэнцкіх інтэрнатах;

– стварэнне бяспечных умоў працы;

– энергаэфектыўнасць і эканомія паліва-энергетычных рэсурсаў.

Рэалізацыю дадзеных задач плануецца здзейсніць шляхам правядзення наступных мерапрыемстваў:

– забяспечыць своечасовую распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па аб’ектах універсітэта, запланаваных для правядзення капітальнага рамонту і мадэрнізацыі;

– забяспечыць увод у эксплуатацыю спартыўна-культурнага цэнтра;

– правесці комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на ўкараненне энергаэфектыўнага абсталявання будынкаў, забяспечыўшы да 2015 г. эканамічны эфект – эканомію 66 тон умоўнага паліва ў год;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– зрабіць замену ўстарэлай мэблі і абсталявання ў студэнцкіх інтэрнатах, вучэбных аўдыторыях, месцах агульнага карыстання;

– зрабіць аснашчэнне дэканатаў, кафедральных памяшканняў, адміністрацыйных падраздзяленняў сучаснай камп'ютарнай і аргтэхнікай, мэбляй і абсталяваннем;

– арганізаваць закупку камп'ютарнай тэхнікі для павелічэння колькасці камп'ютарных лабараторый, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе, удвая к 2015 г.;

– абсталяваць сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання паточныя лекцыйныя аўдыторыі ўніверсітэта;

– распрацаваць і рэалізаваць стандарты тэхнічнай аснашчанасці кафедраў спецыялізаванай тэхнікай, сцэнічнымі касцюмамі, музычнымі інструментамі для паўнацэннай арганізацыі вучэбнага працэсу па замацаваных спецыяльнасцях і напрамках.

## V. ФІНАНСАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАГРАМЫ

Фінансаванне мерапрыемстваў Праграмы прадугледжваецца здзяйсняць за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, выдзяляемых на ўтрыманне ўніверсітэта. Таксама плануецца прыцягненне:

– сродкаў ад прыносячай даход пазабюджэтнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;

– сродкаў, выдзяляемых Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях, Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных навуковых даследаванняў; спецыяльных грантаў у рамках зацверджаных навуковых праграм, заданняў і інавацыйных праектаў;

– сродкаў беларускіх і міжнародных арганізацый, фондаў і аб'яднанняў;

– спонсарскіх паступленняў.

Дзяржаўная падтрымка Праграмы ажыццяўляецца па параграфу «Вышэйшая адукацыя» раздзела «Адукацыя» класіфікацыі расходаў бюджэту. У 2011–2015 гг. за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту выдзяляецца 6,145 млрд руб. на мерапрыемствы па развіцці адукацыйнай і інфармацыйнай інфраструктуры і 43,41 млрд руб. на мерапрыемствы па капітальным рамонце коплексу будынкаў універсітэта.

## VI. ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМЫ к 2015 г.

Рэалізацыя прыярытэтных напрамкаў Праграмы забяспечыць канкурэнтаздольнасць адукацыйных праграм і навуковых даследаванняў на міжнародных рынках, арганізацыйную ўстойлівасць і міжнароднае прызнанне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У 2012 г. завершыцца пераход на адукацыйныя стандарты 2-га пакалення. На аснове аналізу айчыннага і сусветнага вопыту падвышэння якасці за кошт патрабаванняў да структуры, зместу, практычнай накіраванасці, матэрыяльна-тэхнічнага, вучэбна-метадычнага і інфармацыйнага забеспячэння адукацыйных праграм плануецца перайсці на новы якасны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў.

Паралельна будуць праведзены мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў. Нароўні з выкарыстаннем механізмаў конкурснага адбору на пасады прафесарска-выкладчыцкага саставу мерапрыемствы Праграмы дазваляюць, захаваўшы ядро выкладчыцкага калектыву, істотна падвысіць эфектыўнасць іх працы і дасягнуць к 2015 г. новай якасці выкладчыцкага корпусу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Мяркуецца істотна пашырыць практыку і тэхналогіі распаўсюджвання пазітыўнага вопыту адукацыйнай дзейнасці ўніверсітэта ў сістэме вышэйшай адукацыі. Узрасце колькасць слухачоў праграм дадатковай адукацыі, у тым ліку аб'ём павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў іншых ВНУ.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў зойме лідзіруючыя пазіцыі ў інтэрнацыянальнай адукацыйнай дзейнасці. Гэта падвысіць канкурэнтаздольнасць універсітэта, дазволіць істотна пашырыць экспарт адукацыйных паслуг і павялічыць колькасць навучэнцаў – замежных студэнтаў на 80% к 2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў увойдзе ў лік прызнаных у айчынным і міжнародным акадэмічным асяроддзі лідараў фундаментальных навуковых даследаванняў, а таксама пашырыць спектр прыкладных даследаванняў, у тым ліку для стварэння камерцыйных прадуктаў на аснове вынікаў даследчых работ.

Павялічыцца доля навукова-педагагічных работнікаў, якія вядуць навуковую работу ў рамках фінансавання за кошт беларускіх і міжнародных навуковых фондаў. Падвысіцца эфектыўнасць удзелу навукова-педагагічных работнікаў універсітэта ў рэалізацыі галіновых, рэспубліканскіх і міжнародных праграм і праектаў.

Узровень навуковых даследаванняў, матэрыяльна-тэхнічнага, інфраструктурнага і кадравага забеспячэння ўмоў навуковай работы зробіць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў прывабным для замежных даследчыкаў. Узрастуць паказчыкі акадэмічнай мабільнасці вучоных універсітэта і колькасць сумесных праектаў з даследчымі калектывамі замежных навукова-адукацыйных цэнтраў.

Высокая эфектыўнасць фундаментальных і прыкладных даследаванняў падвысіць прывабнасць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў для заказчыка прыкладных даследаванняў, пашырыць кола яго партнёраў і забяспечыць рост аб'ёмаў фінансавання навуковых даследаванняў, што дазволіць забяспечыць к 2015 г. долю даходаў ад рэалізацыі аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці да 5% ад агульнага аб'ёму пазабюджэтных паступленняў.

Універсітэт зойме лідзіруючыя пазіцыі ў галіне экспертнай дзейнасці. На аснове існуючага вопыту будзе сфарміраваная практыка аказання платных экспертных паслуг. Дзеля гэтага к 2012 г. будзе завершана праца па фарміраванні ўніверсітэцкага корпусу экспертаў шырокага спектра напрамкаў, распрацавана і рэалізавана тэхналогія прыцягнення заказаў на экспертныя паслугі ад органаў улады, дзяржаўных арганізацый, прыватных структур.

Выхад адукацыйнай, навукова-даследчай, інавацыйнай, мастацка-творчай дзейнасці на якасна новы ўзровень дазволіць Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў як лідару сістэмы вышэйшай адукацыі ў сацыякультурнай сферы засяродзіць намаганні на рашэнні наступных ключавых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь:

– развіццё чалавечага патэнцыялу, задавальненне эстэтычных патрэбнасцей асобы, рэалізацыя здольнасцей і талентаў праз навукова абгрунтаваную практыку стварэння і рэалізацыі актуальных адукацыйных праграм;

– развіццё кадравых рэсурсаў для інтэграванай з вышэйшай адукацыяй сістэмы навуковых даследаванняў і распрацовак, стымулюючых інавацыйнае развіццё;

– фарміраванне сацыяльна адказнай, інтэлектуальнай эліты, спрыяючай устойліваму функцыянаванню дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў;

– кадравае, навуковае, экспертнае забеспячэнне функцыянавання і развіцця сацыякультурнай сферы на аснове інавацыйнага развіцця навукова-тэхналагічнага патэнцыялу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ